Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 КРАСАВІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 70 (28180) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як зменіцца супрацьтытунёвы дакумент

СТАР. 3




Гомельшчына ў фотаздымках

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Эдвард МАТУЛІС, намеснік міністра гандлю:**

*«Міністэрства гандлю не чакае змянення цэн у сувязі з дэнамінацыяй. Выдаткі, звязаныя з мадэрнізацыяй касавага і вагавага абсталявання, набыццём новых апаратаў і іншымі тэхнічнымі затратамі, не павінны ўключацца ў канчатковы кошт тавараў. Як правіла, любая мадэрнізацыя альбо аднасіцца да выдаткаў вытворчасці, альбо пакрываецца за кошт прыбытку, які маюць гандлёвыя прадпрыемствы. Міністэрства гандлю адсочвае працэс цэнаўтварэння, таму суб'екты гаспадарання не змогуць скарыстацца дэнамінацыяй як прычынай для павелічэння цэн».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.04.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19989,00 | ▲ |
| Еўра | 22485,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 301,07 | ▼ |
| Укр. грыўня | 778,39 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16070

# Высокі форум

**Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у 13-м саміце Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва ў Стамбуле. Кіраўнік беларускай дзяржавы быў запрошаны на форум у якасці спецыяльнага госця. Удзельнікаў саміту сустракаў асабіста Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган.**




Фота БЕЛТА.

Мерапрыемства праходзіць раз у тры гады. Сёння яго дэвіз — «Адзінства і салідарнасць у імя справядлівасці і міру». На саміце прадстаўлены 56 дзяржаў, у тым ліку 33 — на ўзроўні прэзідэнтаў і прэм'ер-міністраў. Асаблівая ўвага на сустрэчы надавалася палесцінскай праблеме.

Арганізацыя ісламскага супрацоўніцтва аб'ядноўвае каля 60 краін мусульманскага свету з насельніцтвам у паўтара мільярда чалавек. Беларусь і гэтая міжнародная структура маюць у многім блізкія погляды і прыярытэты на міжнароднай арэне. У першую чаргу ў такіх сферах, як традыцыйныя каштоўнасці, рэлігійная талерантнасць, устойлівае развіццё.

Кіраўнік беларускай дзяржавы выступіў на форуме з прамовай, у якой выклаў пазіцыю Беларусі па акрэсленых пытаннях. Аляксандр Лукашэнка таксама правёў шэраг сустрэч з лідарамі краін, якія прадстаўлены на саміце.

## Сацыяльны рэпартаж

# «ХАЧУ ДАЖЫЦЬ У СВАЁЙ КВАТЭРЫ!»

## 93-ГАДОВАЯ ПЕНСІЯНЕРКА НЕ ЗГОДНА З ЗАКЛЮЧЭННЕМ МЕДЫКАЎ

**«Калі б мне гэту гісторыю расказалі, падумала б, што такога не можа быць». У аднапакаёвай «хрушчоўцы» ў цэнтры Мінска стаіць пах карвалолу. Гаспадыня кватэры, пенсіянерка Клаўдзія БАРАЎКОВА, сядзіць на старэнькай канапе і, выціраючы слёзы, расказвае, як год таму страціла спакой. У свае 93 гады ветэран вайны вымушана хадзіць па судах — даказваць, што з'яўляецца дзеяздольнай. Клаўдзія Нікандраўна самастойна абслугоўвае сябе, добра арыентуецца ў коштах на прадукты і можа працытаваць вершы са школьнай праграмы. Чаму ж тады псіхічнае здароўе адзінокай бабулі ставяць пад сумненне? Пенсіянерка ўпэўнена: прычына — яе адмова пераехаць з уласнай кватэры ў інтэрнат, на чым так настойвалі органы апекі.**

### Сказалі «на рэнтген» — завялі да псіхіятраў

Свае найлепшыя гады Клаўдзія Нікандраўна правяла на вайне. Была радысткай-кадзіроўшчыцай у авіяцыі. Атрымлівала зашыфраваныя прагнозы ад сіноптыкаў, па якіх потым складалі карты надвор'я.

— Я з таго пакалення, калі Радзіма казала — трэба, і мы выконвалі. Вайна — ідзём на абарону. Аднаўляць народную гаспадарку — мы тут, — кажа пенсіянерка.

Клаўдзія Нікандраўна паспела атрымаць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці інжынер-хімік. Усё жыццё працавала ў шкодных умовах. «На заводзе, дзе я рабіла, была сапраўдная душагубка», — узгадвае бабуля.

Родных у старой не засталося. Магчыма, жывыя пляменнікі, але Клаўдзія Нікандраўна на шмат гадоў іх не бачыла. Замужам жанчына не была.

— Маё пакаленне самае няшчаснае ў гэтым плане, — заўважае пенсіянерка. — У арміі былі юнакі, закаханыя ў мяне, якія прапаноўвалі пажаніцца. Абодва Сашы. Адзін сібірак, другі з Іванава. А я тады жыла ў Маскве і нікуды адтуль з'язджаць не хацела. Запрасіць сваіх жаніхоў да сябе не магла: у нашай камуналцы было цесна. І вось так мы расталіся. Саша з Іванава і пасля вайны пісаў, прасіў дазволу сустрэцца. Не пабачыліся... Быў потым грамадзянскі шлюб. Але такога чалавека, якога хацела б сабе ў спадарожнікі, я не сустрэла.

СТАР. 4

## Надвор'е

# Цеплыня яшчэ з норавам

**Спецыялісты Белгідраметцэнтра адзначаюць, што няўстойлівае надвор'е захаваецца ў нашай краіне яшчэ да сярэдзіны наступнага тыдня. Нягледзячы на дажджы, на працягу бягучага тыдня тэмпературны фон застаецца на высокім узроўні — перавышаў кліматычную норму на 5-9 градусаў.**



Фота БЕЛТА.

Сёння крыху пахаладае, але будзе пераважна без ападкаў, толькі месцамі па ўсходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Максімальная тэмпература паветра — плюс 8-14 градусаў. У суботу на тэрыторыю краіны завітае малаактыўны атмасферны фронт, які перамяшчаецца з боку Заходняй Еўропы. Уначы па паўднёвым захадзе краіны, а ўдзень — месцамі, пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі туман.

СТАР. 3

# ПАВЯЛІЧЫЦЬ ІНТЭНСІЎНАСЦЬ УЗАЕМААДНОСІН

### Беларусь і Турцыя маюць намер актуалізаваць парадак дня двухбаковага супрацоўніцтва

**Аляксандр Лукашэнка ў час праведзенай у Стамбуле сустрэчы з Прэзідэнтам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам прапанаваў актуалізаваць парадак дня беларуска-турэцкага супрацоўніцтва, ажыццявіўшы перазагрузку па шэрагу канкрэтных напрамкаў з акцэнтам на гандлі і эканоміцы, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Настаў момант актывізаваць супрацоўніцтва, актуалізаваць парадак дня, адкарэкціраваць дарожную карту адносін», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь адкрыта да супрацоўніцтва з Турцыяй.

Кіраўнікі дзяржаў дамовіліся, што тэмы, якія абмяркоўваліся на гэтай сустрэчы, атрымаюць далейшае практычнае развіццё ў час маючага адбыцца ў маі пасяджэння міжурадавай беларуска-турэцкай камісіі. Размова ішла аб перспектывах павелічэння турэцкіх інвестыцый у Беларусь, больш актыўным узаемадзеянні ў сферы турызму, у тым ліку шляхам павелічэння інтэнсіўнасці авіязносін паміж краінамі.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў Рэджэпу Таіпу Эрдагану за запрашэнне прыняць удзел у саміце Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва, падкрэсліўшы важнасць для Беларусі прысутнасці на такім маштабным форуме. Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, пляцоўка саміту таксама будзе садзейнічаць устанаўленню новых кантактаў для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з шэрагам краін.

У сваю чаргу Рэджэп Таіп Эрдаган адзначыў, што такія сустрэчы на вышэйшым і высокім узроўнях уносяць вялікі ўклад у развіццё двухбаковых адносін. Ён падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца вострававам стабільнасці ў рэгіёне.

Прэзідэнт Турцыі пацвердзіў гатоўнасць наведаць Беларусь з візітам, парадак дня якога ў тым ліку будзе абмяркоўвацца на маючым адбыцца пасяджэнні міжурадавай камісіі.

Кіраўнікі дзяржаў таксама падрабязна абмеркавалі міжнародны парадак дня.

# РАЗЛІК — НА ДОЎГАТЭРМІНОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з Эмірам Дзяржавы Катар шэйхам Тамімам бен Хамадам аль-Тані. Сустрэча адбылася на палях саміту Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва, што праходзіць у Стамбуле, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Лідары дзвюх краін абмеркавалі розныя аспекты беларуска-катарскага супрацоўніцтва, у тым ліку перспектыўныя напрамкі развіцця ўзаемадзеяння ў сферы эканомікі. У цэнтры ўвагі таксама былі праблемныя пытанні ў сусветнай эканоміцы ў цэлым.

Аляксандр Лукашэнка і Тамім бен Хамад аль-Тані пацвердзілі гатоўнасць і ў далейшым развіваць адносіны паміж дзвюма краінамі. «Спадзяёмся, што адносіны паміж Беларуссю і Катарам будуць развівацца, і Катар зможа разглядаць Беларусь у якасці доўгатэрміновага партнёра», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У сваю чаргу, Тамім бен Хамад аль-Тані адзначыў, што для Катара адносіны з Беларуссю вельмі важныя і маюць стратэгічны характар. Ён заявіў аб гатоўнасці катарскага боку выбудоўваць узаемадзеянне з Беларуссю па ўсіх напрамках.

# З ПАЗІЦЫІ АГУЛЬНЫХ ПАМКНЕННЯЎ

### Казахстан прапануе Беларусі актыўна выкарыстоўваць яго транспартную структуру для гандлю з Кітаем

**Аб гэтым было заяўлена на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Казахстана Нурсултанам Назарбаевым, што прайшла ў Стамбуле на палях саміту Арганізацыі ісламскага супрацоўніцтва, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Лідары дзвюх краін мелі магчымасць для абмеркавання розных пытанняў не толькі ў ходзе гэтай сустрэчы, але і ў кулуарах міжнароднага форуму. «Мы з вамі правялі ўжо доўгія перагаворы, абмеркавалі праблемы як міжнародныя, так і мясцовыя, дамовіліся аб вашым візіце ў Беларусь і маім прыездзе ў Казахстан», — сказаў Аляксандр Лукашэнка ў пачатку сустрэчы.

Паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, маючыя адбыцца сустрэчы на вышэйшым узроўні дадуць магчымасць сур'ёзна прааналізаваць праблемныя моманты, якія ўзнікаюць пад уплывам сусветнага эканамічнага крызісу. «Сённяшняя сустрэча — гэта крок да таго, каб абмяркоўваць гэтыя пытанні і праблемы», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка таксама павіншаваў Нурсултана Назарбаева з удачным выступленнем на саміце, адзначыўшы вялікі інтарэс да меркавання постсавецкіх мусульманскіх рэспублік.

У сваю чаргу, Нурсултан Назарбаеў выказаў задавальненне магчымасцю сустрэцца. Паводле яго слоў, развіццё эканамічных адносін паміж краінамі ідзе добрымі тэмпамі. Больш таго, Беларусь і Казахстан з'яўляюцца членамі Еўразійскага эканамічнага саюза і АДКБ. «Таму любая сустрэча для нас карысна», — сказаў Прэзідэнт Казахстана.

Ён расказаў, што ў канцы мая ў Астане плануецца мерапрыемства на вышэйшым узроўні ў фармаце ЕАЭС. «Думаю, у нас там будзе асобная сустрэча, магчымасць звярыць гадзіннікі. Мы — брацкія краіны, у нас агульныя мэты, агульныя памкненні і саюзнікі», — падкрэсліў Нурсултан Назарбаеў.

Асобна ён акцэнтаваў увагу на добрых перспектывах для Беларусі па выкарыстанні транспартнай інфраструктуры Казахстана для развіцця гандлёвых адносін з Кітаем. Нурсултан Назарбаеў растлумачыў, што за апошні час многае зроблена для развіцця гэтай сферы, што значна паскарае дастаўку грузаў.

***

Беларусь і Пакістан дасягнулі ўражальнай дынамікі ў развіцці двухбаковых адносін па самых розных напрамках. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Стамбуле з Прэзідэнтам Пакістана Мамнунам Хусэйнам. «Мінулы год для нашых краін стаў асаблівым. Ён увойдзе ў гісторыю, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мы без гучных слоў наладзілі за адзін год стратэгічнае партнёрства паміж Пакістанам і Беларуссю».

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што яго ўразіла апаратыўнасць пакістанскага боку ў вырашэнні самых сур'ёзных пытанняў, у тым ліку па арганізацыі міждзяржаўных візітаў на самым высокім узроўні. «Мы вельмі апаратыўна рушылі наперад на многіх напрамках нашага супрацоўніцтва. Наша задача — паскорыцца, і мы да гэтага гатовы па ўсіх напрамках», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

***

Беларусь разлічвае на ўзмацненне гандлёва-эканамічных адносін з Інданезіяй і дасягненне тавараабароту на ўзроўні больш як $1 млрд, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы ў Стамбуле з віцэ-прэзідэнтам Інданезіі Юсуфам Калам.

Як адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы, у час яго візіту ў Інданезію некалькі гадоў таму бакі дасягнулі нямала дамоўленасцей, рэалізацыя якіх прадаўжаецца і цяпер. «Мы ўсё больш і больш прыбаўляем у тавараабароце, але, думаю, лепшыя гады Беларусі і Інданезіі наперадзе. І я ўпэўнены, што нам удасца нарасціць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівы акцэнт у час сустрэчы быў зроблены на перспектывах узаемадзеяння ў прамысловасці. Беларусь у гэтым напрамку гатова ствараць сумесныя прадпрыемствы на тэрыторыі Інданезіі, улічваючы вялікую неабходнасць гэтай краіны ў грузавіках і іншай тэхніцы, вытворчасць якой асвоена ў Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што беларускі бок таксама чакае візіту кіраўніцтва Інданезіі ў Мінск. «Мы маглі б у выніку гэтага візіту выйсці не толькі на аб'ёмы тавараабароту, але і пашырыць наменклатуру тавараў, якімі гандлююць нашы краіны», — сказаў беларускі лідар.

***

Кіраўнік беларускай дзяржавы на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Афганістана Абдулой Абдулой выказаў задаволенасць добрым узроўнем дыпламатычнага ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і Афганістанам. Ён адзначыў, што ў размовах з прэзідэнтамі Туркменістана і Таджыкістана часта ўзнімалася тэма таго, як і чым жыве Афганістан, якая ў яго будучыня. «Яны мяне заўсёды пераконвалі ў тым, што Афганістан жыве і развіваецца. І я рабіў для сябе выснову, што ў Афганістане нам заўсёды знойдзецца шмат мірнай работы», — сказаў беларускі лідар.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у выніку пэўных гістарычных абставін Беларусь адчувае сваю адказнасць перад афганскім народам. «Мы гатовы да супрацоўніцтва з Афганістанам па ўсіх напрамках. Забароненых тэм абсалютна няма», — запэўніў кіраўнік дзяржавы.

Ён прапанаваў Афганістану стварыць неабходную для развіцця супрацоўніцтва нарматыўна-прававую базу, заключыўшы класічныя пагадненні, напрыклад, аб узаемнай падтрымцы і абароне інвестыцый, а таксама вызначыць 3-4 фундаментальныя праекты. «Будзем рухацца ў такім напрамку, а пасля гэтых праектаў з'явяцца дзясяткі іншых. Упэўнены, што вы будзеце супрацоўнічаць з намі з вялікім інтарэсам, — сказаў Прэзідэнт. — Аднаўленне вашай краіны, развіццё Афганістана запатрабуе ўсяго таго, што ёсць у Беларусі. І мы гатовы да супрацоўніцтва, стварэння сумесных вытворчасцей, у тым ліку на тэрыторыі Афганістана, той тэхнікі, якая вам будзе патрэбна».

■ Да вашага стала




# ФАРЭЛЬ ПА-РАДЗІВІЛАЎСКУ

### Калісьці далікатэсную рыбку спажывалі магнаты, а цяпер яе разводзяць у прамысловых маштабах

**Сцерлядзь, бялуга, асетр і нават афрыканскі сом... Гэтым «іншаземцам» у айчынных крамах ужо ніхто не здзіўляецца. Але паспытаць элітнай рыбкі не кожнаму па кішэні — дарагавата. Беларускія рыбныя гаспадаркі па гадоўлі каштоўных парод рыб працуюць над зніжэннем сабекошту прадукцыі. І, магчыма, ужо ў найбліжэйшы час пакаштаваць далікатэсную прадукцыю змогуць нашы суайчыннікі з любым дастаткам.**


Фота Васіля ЗЯНЬКО.

На берагах ракі Сула, што ў Стаўбцоўскім раёне, месяцца філіял адкрытага акцыянернага таварыства «Альба» па развядзенні радужнай фарэлі. Асноўная вытворчасць знаходзіцца ў суседнім Нясвіжскім раёне. Сажалкі рыбгаса «Альба» на рацэ Уша пабудаваны ў пачатку XIX стагоддзя пры князях Радзівілах. Гэтыя вадаёмы не бяднеюць на рыбу і да гэтага часу.

Месца для філіяла таксама выбралі невыпадкова. Тут прыдатныя для патрабавальнай і капрызнай «іншаземкі» ўмовы: чыстая вада са спрыяльным тэмпературным рэжымам і хімічнымі паказчыкамі.

— Першая чарга таварнай фарэлевай гаспадаркі пачала дзейнічаць у 2014 годзе, — расказаў дырэктар рыбгаса «Альба» Міхаіл Трусевіч. Вытворчая магутнасць яе — 134 тоны рыбы за год. Цяпер распрацоўваецца праектная дакументацыя на будаўніцтва другой чаргі. Увесці яе ў дзеянне плануецца ў 2018-м, што дазволіць гадаваць 270 тон фарэлі. У цэлым акупіць праект плануецца за сем гадоў.

Сёння вытворчасць 1 кілаграма фарэлі абыходзіцца прадпрыемству ў 65 тыс. рублёў. Прадаецца яна ў сеткавыя крамы па 90 тыс. рублёў. Амаль траціна затрат прыпадае на корм, паколькі ён закупляецца ў Польшчы.

— Каштоўныя віды рыб разводзяць у штучных умовах, не ў нагульных сажалках, як, напрыклад, карпа. І гэта патрабуе жорсткага захавання тэхналогій. Але з цягам часу ўсё гэта акупляецца. Разам з тым варта пераарыентавацца на айчынны корм, што дазволіць зменшыць затраты, — лічыць **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**, які наведаў фарэлевую гаспадарку.

**У 2015 годзе ў Беларусі было выгадавана 353,5 тоны каштоўных відаў рыбы, сёлета плануецца 800 тон. Да 2020-га аб'ём вытворчасці яе ўзрасце да 1,2 тыс. тон.**

Як адзначыў кіраўнік філіяла, пытанне цалкам вырашальнае. Пачаліся перамовы з Жабінкаўскім камбікормавым заводам на пастаўку «правіянту» для фарэлі, што дазволіць знізіць сабекошт прадукцыі на 10%. Акрамя таго, спецыялісты Горацкай сельгасакадэміі маюць намер распрацаваць спецыяльнае меню для рыбы.

Менавіта ад добрага догляду і рацыёну харчавання залежыць здароўе і захаванасць элітнай рыбы.

— Нормы кармлення фарэлі рэкамендуюцца вытворцамі кармоў. Мы іх крыху рэгулюем, у залежнасці ад колькасці і вагі асобін, ад тэмпературы вады: чым вышэйшая тэмпература, тым лепшы апетыт у рыбы, — распавёў галоўны рыбавод гаспадаркі Руслан Раўнівых. — Кормім рыбу 6 разоў на суткі. На некаторых прадпрыемствах 3-разовае харчаванне і толькі днём. У цемнаце фарэль не есць. У нас жа дастатковая асветленасць, каб карміць і ноччу.

Фарэль, як сцвярджае Руслан Вячаслававіч, — пражэрлівы драпежнік, які можа паядаць сабе падобных меншых памераў. Таму ў кожным з басейнаў утрымліваюць экземпляры аднолькавай вагі: па 800, 575, 370 грамаў. Фарэль расце хутка, за паўгода дасягае кілаграма. Вядома, пры спрыяльных умовах. Таму тэмпература вады і колькасць у ёй кіслароду пастаянна кантралююцца.

У чатырох басейнах жыве 26 тыс. асобін. Вада ў іх паступае з артэзіянскай свідравіны.

— Маем магчымасць браць ваду з ракі. Але пакуль у гэтым няма патрэбы. У свідравіне тэмпература вады вышэйшая, чым у Суле. У выніку — меншыя затраты на яе падагрэў, — канстатуе Руслан Вячаслававіч.

Сёлета ў гаспадарцы плануюць вырасціць 100 тон фарэлі. У гандлёвую сетку паступае жывая або ахаладжаная фарэль вагой 1-1,5 кілаграма. Менавіта вытворчасць рыбы такіх памераў для гаспадаркі рэнтабельная. Для перапрацоўкі неабходна, каб фарэль нагульвала вагу да 4 кілаграмаў. А гэта для вытворцы нявыгадна, паколькі павялічваецца кармавы складнік і адпаведна — сабекошт.

Па словах дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Белводгас» Сяргея Ляцко, у 2015 годзе ў Беларусі было выгадавана 353,5 тоны каштоўных відаў рыбы, сёлета плануецца — 800 тон. Да 2020-га аб'ём вытворчасці яе ўзрасце да 1,2 тыс. тон. Гэта прадугледжана праграмай развіцця аграбізнесу Беларусі на 2016—2020 гады.

— Папярэдні склад урада паставіў задачу максімальна вырашыць пытанні забеспячэння жыхароў краіны рыбай. Мы пайшлі не толькі шляхам павелічэння аб'ёмаў вядомых азёрных парод. Акцэнт быў зроблены на тое, каб забяспечваць сябе максімальна каштоўнымі відамі рыб: асятровымі, фарэлевымі. На гэта арыентавала Рэспубліканская праграма развіцця рыбнай галіны на 2010—2015 гады. Яна выканана не ў поўным аб'ёме, але адбыліся значныя зрухі ў лепшы бок. Многія рэгіёны ўжо маюць дастаткова добрыя вынікі. У першую чаргу Магілёўская вобласць, якая ўвяла ў мінулай пяцігодцы шэраг магутнасцей па вытворчасці каштоўных парод рыб: у Бялынічах, Быхаве, Касцюковічах. Невялікія вытворчасці створаны на Віцебшчыне, дастаткова актыўна пачалі займацца гэтай справай у Мінскай вобласці, — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

Акрамя таго, старшыня Савета Рэспублікі засяродзіў увагу на тым, што аднагасова з павелічэннем аб'ёмаў вытворчасці вырашаюцца пытанні поўнага тэхналагічнага цыкла гадоўлі каштоўнай рыбы. У Горках створаны комплекс па развядзенні малькоў фарэлі. Гэтым пасадачным матэрыялам карыстаецца і рыбная гаспадарка «Альба». І, як сцвярджаюць спецыялісты, заменнік імпарту добра сябе зарэкамендаваў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Шкодная звычка

# ЦЫГАРЭТАМ ДАДУЦЬ ПРЫКУРЫЦЬ



**Ужо сёлета мы адчуем, як гэта — глядзець на свет без дымавой заслоны. Дапаўненні і змяненні ў галоўны антытытунёвы дакумент — Дэкрэт №28 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — знаходзяцца на разглядзе ў Савеце Міністраў.**

З 194 краін свету 180, у тым ліку і наша, ратыфікавалі рамачную канвенцыю Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па барацьбе супраць тытуню. Існуе шмат спосабаў такой барацьбы. Беларусь нямала зрабіла за дзесяць гадоў, але наперадзе яшчэ больш важкія крокі. Сярод апошніх нашых дасягненняў — забарона рэкламы, спонсарства і іншага прасоўвання тытунёвай прадукцыі, а таксама забарона на адкрытую выкладку такога тавару ў месцах продажу. Зусім крыху засталося і да таго, як зменіцца цыгарэтная ўпакоўка (палову плошчы ўрэшце будуць займаць надпісы і карцінкі-папярэджванні аб шкодзе курэння). «Наспеў час абараняць тых, хто не курыць, хто працуе там, дзе могуць курыць, а таму патрабуецца поўная забарона на курэнне ў грамадскіх памяшканнях, — адзначае **прадстаўнік Еўрапейскага бюро СААЗ, спецыяліст па кантролі за неінфекцыйнымі захворваннямі Ларс МОЛЕР.** — Сусветная практыка паказвае, што ўладальнікі бараў і рэстаранаў застаюцца пры гэтым у выйгрышы — колькасць наведвальнікаў павялічваецца за кошт сем'яў з дзецьмі».

Крытычным момантам застаецца пакуль кошт на тытунёвую прадукцыю. Цэны ў нас ніжэйшыя, чым нават у суседніх краінах, не кажучы пра далёкае замежжа, дзе даўно пераканаліся, што рост цэн прыводзіць да зніжэння спажывання. Аднак патэнцыйны вытворца пры гэтым не церпіць страт: нават пры змяншэнні колькасці курцоў даход дзяржавы расце. Адначасова для дзяржавы адкрываюцца выдатныя магчымасці эканоміі сродкаў у галіне аховы здароўя, падкрэслівае спадар Молер. Пакуль жа ў Беларусі нізкі кошт на цыгарэты толькі правакуе кантрабанду гэтага тавару ў краіны-суседкі.

Як адзначае **намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Людміла НАРОЙЧЫК,** кошт цыгарэт у нас штомесяц расце, і рэзкага скачка да таго ўзроўню, што ёсць за мяжой, не чакаецца. «Міністэрства аховы здароўя робіць усё, што можа, — падкрэслівае Людміла Наройчык. — Шкода курэння відавочная, і многія людзі ўжо разумеюць абгрунтаванасць прыняцця жорсткіх захадаў, аднак мы маем справу з вельмі цяжкай залежнасцю і сур'ёзнымі стэрэатыпамі. Спадзяёмся, што рэалізацыя новых мер па барацьбе з тытунём сёлета дапаможа пераадолець стэрэатыпы».

Відавочна, зніжэнне курэння стане справай вельмі нялёгкай, бо пэўная катэгорыя людзей не «адпусціць» цыгарэту пры любым раскладзе. Таму цяпер дзяржава плануе працаваць на апераджэнне — каб залежнасць не прыцягвала новых ахвяр.

## Што плануецца?

• Выраўнаваць электронныя цыгарэты да тытунёвых вырабаў. Адсюль забарона продажу электронных цыгарэт асобам ва ўзросце да 18 гадоў і выкладкі ў месцах гандлю.

• Пашырыць пералік месцаў, дзе будзе забаронены продаж тытунёвых і электронных цыгарэт, — у памяшканнях і на тэрыторыях, якія займаюць арганізацыі фізічнай культуры, спорту, установы адукацыі, аховы здароўя, санаторна-курортныя ўстановы.

• Забараніць спажыванне тытунёвых вырабаў і электронных сістэм курэння ў ліфтах і дапаможных памяшканнях дамоў, інтэрнатаў, на балконах і лоджыях агульнага карыстання, на пляжах, рабочых месцах і ў вытворчых памяшканнях, на прыпынках па ўсёй краіне.

• Забараніць курэнне ў аўтамабілях і памяшканнях у прысутнасці дзяцей да 14 гадоў.

• Забараніць курэнне ў памяшканнях, якія займаюць арганізацыі фізічнай культуры, спорту, фізкультурна-спартыўных збудаванняў і на іх тэрыторыях.

• Забараніць курэнне ў памяшканнях і на тэрыторыях дзяржаўных органаў культуры, аховы здароўя, адукацыі, гасцініцах, на пасажырскіх платформах вакзалаў, на аб'ектах грамадскага харчавання.

• Стварыць зоны для курэння, якія павінны адпавядаць патрабаванням Міністэрства аховы здароўя і па надзвычайных сітуацыях (мець такую сістэму вентыляцыі, каб ніякі дым не пранікаў у іншыя памяшканні). На вялікіх аб'ектах такія зоны могуць размяшчацца на вуліцы.

• Індывідуальныя прадпрымальнікі, юрыдычныя асобы, уладальнікі атрымаюць права на самастойную забарону курэння.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# Цеплыня яшчэ з норавам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — 8-15 цяпла. Больш камфортна будзе па паўднёвым захадзе, дзе ўначы прагназуецца плюс 4-6 градусаў, удзень — да 19 цяпла.

Даволі актыўныя атмасферныя франты з боку Заходняй Еўропы завітаюць да нас і ў нядзелю. Тады кароткачасовыя дажджы будуць адзначацца ў многіх раёнах краіны, а месцамі з навальніцамі. Стане цяплей. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-10 градусаў, удзень — ад 10 да 17 цяпла, а па паўднёвым усходзе прыгрэе месцамі нават да плюс 21 градуса.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, на пачатку наступнага тыдня ў Беларусі, пад уплывам атмасферных франтоў з боку Балтыкі, захаваецца няўстойлівае надвор'е з дажджамі і навальніцамі. Так, у панядзелак амаль паўсюдна пройдуць дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра складзе плюс 1-8 градусаў, удзень — 8-15 цяпла. Надалей — у аўторак і сераду кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі месцамі па краіне, аднак удзень магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 1-6 цяпла, у ноч на сераду пры праясненнях — да мінус 2 градусаў, удзень — 6-13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62**

**Продавец:** ОАО «КУПЦОВЪ», Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1, (029) 509-02-27

Лот №1. Изолированное помещение с инв. №220/D-14404, площадью 845,4 кв.м, наименование – изолированное помещение №1 Административно-бытовой корпус, по адресу: Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1-1; информационный световой указатель «КУПЦОВЪ»; система телефонная; тумба на колесах 2 шт.; жалюзи 4 шт.; поднос; электрочайник; холодильник; телефон 2 шт.; набор мягкой мебели: диван 2-местный, кресло; мышь; электрочайник; тепловентилятор; удлинитель; системный блок; клавиатура; монитор; системный блок; комплект офисной мебели: секция-стенка, стол секретаря, шкаф, тумбочка; шкаф; тумба; система телефонная; стол 2 шт.; аппарат телефонный; шкаф; стол 2-тумбовый; стул 2 шт.; телефон; сейф; удлинитель 3 шт.; сервиз кофейный; набор мебели офисный: шкаф встроенный, полка для картотеки 2 шт.; колонки; электрочайник; телефон; монитор 3 шт.; ПВЭМ 2 шт.: системный блок, монитор; монитор 3 шт.; адаптер сетевой CH 930; факс Panasonic; колонки 2 шт.; стул 4 шт., монитор 2 шт.; тепловентилятор; аппарат телефонный 4 шт.; кувшин 3 шт.; подставка под ПВЭМ 4 шт.; телефон; системный блок 3 шт.; монитор; сейф; стул; тепловентилятор; телефонный аппарат 5 шт.; калькулятор 9 шт.; стул 9 шт.; кассовый аппарат; удлинитель 3 шт.; тепловентилятор 3 шт.; колонки 2 шт.; монитор; мышь; системный блок 2 шт.; клавиатура 2 шт.; набор офисной мебели: двери шкафа купе, подставка под ПВЭМ 2 шт.; факс Panasonic; ноутбук; концентратор Селан ЕНУБ; системный блок 2 шт.; удлинитель; монитор 2 шт.; клавиатура 3 шт.; телефон 3 шт.; калькулятор 5 шт.; стул; набор бокалов; монитор; мини-АТС. Нач. цена: 2 192 236 791 бел. руб. без НДС. Задаток: 219 223 700 бел. руб. Шаг аукциона – 109 612 000 бел. руб.

Лот №2. Капитальное строение с инв. № 220/С-11337, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1 площадью 539 кв.м, наименование – склад-арочник; компрессор передвижной. Нач. цена: 729 311 056 бел. руб. без НДС. Задаток: 72 931 200 бел. руб. Шаг аукциона – 36 466 000 бел. руб.

Лот №3. Капитальное строение с инв. № 220/С-11431, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1 площадью 581,3 кв.м, наименование – столярная мастерская; огнетушитель 32 шт.; замок 3 шт.; пылесос; навигатор; урна; зеркало; калькулятор 2 шт.; машина шлифовальная (дрель); прибор алкатест; леса строительные: секция ВСП 8 шт., комплект стабилизаторов; стол 2 шт.; стул 2 шт.; шкаф; ноутбук; калькулятор; кресло; стул 2 шт.; МФУ Samsung; набор мебели офисный: стол компьютерный, шкаф для одежды, стол приставной; колонки; мышь; клавиатура; удлинитель; системный блок; тумба; стол письменный; сейф; удлинитель; стол; стол; шкаф для одежды 2 шт.; удлинитель; ноутбук; калькулятор 3 шт.; электродрель; удлинитель 3 шт.; монитор 5 шт.; мышь 5 шт.; системный блок 3 шт.; клавиатура 5 шт.; электрочайник; набор офисной мебели: тумба большая, тумба малая, полка вертикальная, подставка под ПВЭМ 3 шт.; СВЧ печь; системный блок; кресло грант 2 шт.; принтер EPSON; принтер; станок многофункциональный, инв. №61; пила продольная, инв. №221; пила продольная, инв. №223; станок заточной, инв. №224; пила торцовочная ЦМЭ-2Б, инв. №230; станок фуговочный, инв. №548; станок для отбора фаски, инв. № б/н. Нач. цена: 1 228 632 302 бел. руб. без НДС. Задаток: 122 863 300 бел. руб. Шаг аукциона – 61 432 000 бел. руб.

Лот №4. Капитальное строение с инв. № 220/С-26817, по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1/2 площадью 951,7 кв.м, наименование – здание холодильника на 500 тонн; скороморозильный агрегат ПХП; щит управления; градирня ГД-50 2 шт.; подъемник К-6 ФП-231; навесной воздухоохладитель 5 шт.; вентилятор с воздухоохладителем 4 шт.. Нач. цена: 5 527 589 538 бел. руб. без НДС. Задаток: 552 759 000 бел. руб. Шаг аукциона – 276 380 000 бел. руб.

Торги состоятся **16.05.2016 в 12.00** по адресу: Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1 в ОАО «КУПЦОВЪ». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и подачи заявлений на участие в торгах: **с 15.04.2016 с 8.30 по 13.05.2016 до 17.30.** Задаток перечисляется на р/с 3012470630033 в РКЦ № 39 в г. Глубокое ф-ла ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление, код 424, УНП 300019596. Получатель платежа: ОАО «КУПЦОВЪ». Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества. Движимое имущество расположено по адресу: Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении.

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со для проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. **Контактные тел. (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

# Паштальён не толькі Печкін

**Мінскі філіял РУП «Белпошта» напярэдадні свайго 20-годдзя правёў адкрыты конкурс дзіцячага малюнка. Днямі падведзены вынікі.**

Паводле іх, праца паштовай сувязі знайшла шырокае адлюстраванне ў сотнях тэматычных малюнкаў: найбольшая колькасць атрымана з Барысаўскага, Стаўбцоўскага, Пухавіцкага і Слуцкага раёнаў. А таму вызначыць найлепшыя творы (асабліва ва ўзроставай групе ад 6 да 9 гадоў) было вельмі складана. На дапамогу, як прызналася **намеснік дырэктара прадпрыемства Алена ІШЧУК,** давялося запрашаць спецыяліста, да таго ж, каб ураўнаваць шанцы на перамогу, усіх удзельнікаў конкурсу падзялілі на катэгорыі. Першыя месцы занялі: у малодшай (сярод дзяцей ад 6 да 9 гадоў) работа **Ірыны Брацянковай з Салігорска;** у сярэдняй (сярод дзяцей ад 10 да 13 гадоў) — **Захара Радзіёна з вёскі Шашкі Стаўбцоўскага раёна** і ў старэйшай (ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў) — **Кацярыны Навіцкай з Валожына.** Другое месца адпавядна — **Ягора Мельнічука з Барысава, Ганны Лук'яненкі з Клецка і Веры Мартынавай з Маладзечна,** трэцяе — **Мацвея Куца з Лагойска, Аліны Бразінскай з Валожына і Аліны Дубаневіч з Вілейкі.** Шэраг удзельнікаў адзначаны спецыяльнымі прызамі. «Мы вельмі ўдзячны ўсім удзельнікам конкурсу за праяўленую цікавасць да работы паштовай сувязі, за адлюстраванне нашых працоўных будняў, — зазначыла Алена Ішчук. — Мяркуючы па малюнках, многія з дзяцей ужо з'яўляюцца нашымі кліентамі, а з часам, магчыма, стануць і супрацоўнікамі, бо яно ж і сапраўды — усё пачынаецца з дзяцінства... Цяпер мы думаем над тым, каб размясціць малюнкі дзяцей у аддзяленнях паштовай сувязі».

**Ул. інф.**




■ Побач

# ВЕТЭРАНЫ — НА АСАБЛІВЫМ УЛІКУ

**Падчас VIII справаздачна-выбарнай канферэнцыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў, якая адбылася ўчора ў Мінску, падвялі вынікі працы за апошнюю пяцігодку, абмеркавалі кірункі дзейнасці на перспектыву. У канферэнцыі ўзялі ўдзел каля 300 прадстаўнікоў ветэранскіх арганізацый з усіх рэгіёнаў Беларусі, дэлегацыі з Расіі, Украіны і Малдовы.**

Як расказаў **старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Іван ГАРДЗЕЙЧЫК,** ветэранскія арганізацыі актыўна ўдзельнічаюць у выхаванні моладзі, што будуць рабіць і на працягу наступных пяці гадоў разам з дзяржаўнымі органамі. «Задача нашай арганізацыі — узмацніць ваенна-патрыятычную работу сярод насельніцтва, асабліва сярод моладзі», — падкрэсліў старшыня ветэранскай арганізацыі.

Як адзначыў **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Аляксандр РУМАК,** на 1 студзеня 2016 года ў нашай краіне налічвалася 14,5 тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. «У той сацыяльнай палітыцы, якую праводзіць наша дзяржава, дапамога ветэранам, пажылым людзям займае асаблівае месца. І якімі ні былі б сацыяльна-эканамічныя ўмовы ў нашай краіне, ад гэтай палітыкі дзяржава не адмовіцца. Аб тым сведчаць і праграмныя дакументы, распрацаваныя ў бягучым годзе і ўжо прынятыя на наступны пяцігадовы перыяд».

— Асноўны кірунак вашай дзейнасці — гэта тое, што неабходна ветэрану, пажылому чалавеку, — звярнуўся да прадстаўнікоў ветэранскіх арганізацый **міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ.** — Гэта ўвага і клопат. Увага і клопат улады, Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў. Адна з асноўных вашых задач — выхаванне падрастаючага пакалення. Выхаванне ў духу адданасці сваёй Радзіме, у духу гатоўнасці абараніць яе. Узброеныя Сілы заўсёды будуць падтрымліваць вас, садзейнічаць вам і дапамагаць.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# «ХАЧУ ДАЖЫЦЬ У СВАЁЙ КВАТЭРЫ!»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сям'ю, як яна сама прызнаецца, замянілі староннія людзі: сястра Таццяна са Свята-Елісавецінскага манастыра і былы сусед Аляксей (яны і звярнуліся да нас у рэдакцыю з просьбай разабрацца ў сітуацыі. **— Н.Л.**). Малады хлопец ужо тры гады наведвае пенсіянерку штодзень, ходзіць для яе па прадукты і ў аптэку, заносіць грошы за камунальныя плацяжы.

А вось сацыяльнага работніка «выбіць» было не так проста. Па словах Клаўдзіі Нікандраўны, яе заяву з просьбай аб аказанні дапамогі вельмі доўга разглядалі і спачатку адмовілі. Маўляў, людзей не хапае. Замест гэтага прапанавалі перасяліцца ў Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы ў Ждановічах.

— Прыйшла жанчына і вельмі нахвальвала жыццё там, — распавядае пенсіянерка. — А навошта мне гэты старэчы інтэрнат? Я катэгарычна адмовілася — і вусна, і пісьмова. Хачу дажыць жыццё ў сваёй кватэры.



Фота Надзеі БУЖАН.

Клаўдзія Нікандраўна не разумее, чаму яе хочуць прызнаць недзеяздольнай.

А пасля пачалося тое, што інакш як страшным сном і не назавеш. Праз колькі дзён у кватэру зайшлі два здаравенныя мужчыны. Не прадставіліся, не далі старой павячэраць, вывелі яе на вуліцу ў тапачках, пасадзілі ў машыну і прывезлі ў бальніцу ў Навінках. Праўда, атрымаць адтуль характарыстыку аб недзеяздольнасці бабулі не ўдалося. У заключэнні псіхатэрапеўта напісана, што ў Бараўковай ёсць пэўныя арганічныя адхіленні, але ў цэлым пенсіянерка здаровая: у яе спакойнае мысленне, яна засяроджваецца на пытаннях, арыентуецца ў абстаноўцы. Ад той «шпіталізацыі» пенсіянерка адыходзіла доўга.

На гэтым гісторыя не скончылася. Месяц таму жанчыне сказалі, што павязуць на рэнтген, а завялі да псіхіятраў. Судова-медыцынская экспертыза, праведзеная па заяве 34-й паліклінікі, якая выконвае функцыі органа апекі і папячыцельства, паставіла псіхічнае здароўе ветэранкі пад сумненне. Але пенсіянерка і яе знаёмыя ўпэўнены ў прадузятасці і не давяраюць вынікам працэдуры...

## «Пакоі захламлены, прадуктаў няма»

У звароце, які паступіў у пракуратуру Савецкага раёна сталіцы ад 34-й паліклінікі, напісана, што Клаўдзія Бараўкова



«Пайшла на вайну ў 18, вярнулася ў 22», — ветэран трымае дарагія для яе ўзнагароды.

неадэкватная, не арыентуецца ў часе, выглядае неахайна, а кватэра захламлена. Органы апекі настойваюць на тым, што ў сілу свайго захворвання старая не можа даглядаць сябе і мае патрэбу ў пастаяннай староннім дапамозе. (У 2010 годзе бабулі сапраўды пад пытаннем паставілі дыягназ «сасудзістая дэменцыя» — пагаршэнне інтэлектуальных здольнасцяў чалавека, выклікана захворваннямі сасудаў галаўнога мозга.)

— Да нас прыходзіў ліст з тэрытарыяльнага цэнтра аб неадэкватных паводзінах Бараўковай, аб антысанітарным стане кватэры, — каментуе **Галіна ЗВЯРКО, загадчыца юрыдычнага сектара 34-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі.** — Нашы ўрачы таксама казалі, што часам не маглі трапіць да яе. Я сама асабіста з актам абследавання прыходзіла да дому да пенсіянеркі разы тры. Кватэра была цалкам захламлена каробкамі. Бараўкова не давала прыбіраць, дазволіла толькі навесці парадак крыху на кухні і памыць акно. Штор там няма, чыстай пасцельнай бялізны таксама. У кладоўку ўвогуле зайсці немагчыма. Мэблі амаль не было. Толькі стаяў стол пасярэдзіне пакоя і «тапчан», на якім старая спіць. Прадуктаў харчавання і нармальнага посуду мы не ўбачылі.

Органы апекі запэўніваюць, што дзейнічаюць выключна ў інтарэсах самой пенсіянеркі і іншых жыхароў дома.

**Суд пакуль прызначыў амбулаторна-камісійную судова-псіхіятрычную экспертызу, якую мусяць правесці незалежныя спецыялісты. Органы апекі, праўда, былі супраць.**

— А раптам яна паставіць на пліту ежу гатавацца і забудзе? Увесь пад'езд спаліць ці ўзарве! — прыводзіць аргумент Галіна Звярко.

Разам з тым, нягледзячы на заявы пра тое, што Клаўдзія Нікандраўна не пускала да сябе спецыялістаў паліклінікі, у яе ёсць рэцэпты на бясплатныя лекі, а ў медыцынскай картцы маюцца запісы аб абследаванні. Сама ж бабуля прызнаецца, што добра ведае, як выглядае яе ўчастковы тэрапеўт, а ў кватэру не давала зайсці толькі незнаёмым урачам.

Што да сацыяльнай службы, якая з мінулага лета ўсё ж такі выдзеліла работніка для ветэрана, то там сцвярджаюць, што сёння з Бараўковай ніякіх праблем няма.

— Наш спецыяліст прыходзіць да Клаўдзіі Нікандраўны два разы на тыдзень. Усё нармальна. Яна кантактная, — адзначылі ў аддзяленні сацыяльнай дапамогі на даму тэрытарыяльнага цэнтра сацабслугоўвання насельніцтва Савецкага раёна.

Кватэра пенсіянеркі сапраўды ўся застаўлена каробкамі. Лядоўні няма, прадукты — гарбата, аўсянка, макарона — захоўваюцца на падаконніку. Клаўдзія Нікандраўна тлумачыць, што гэты хаос звязаны з тым, што яна некалі збіралася пераязджаць. Пакуль родныя былі жывыя, шукала кватэру бліжэй да іх. Абмен так і не адбыўся, а рэчы ў каробках засталіся.

— Тут складзена ўся мая маёмасць, нажытая за 93 гады. Чэшскі гарнітур паліраваны, шмат посуду, адзення, — пералічвае бабуля. — Я не буду ўжо мэблю выстаўляць. Колькі мне тут засталося?.. Тое, што ўсе мае рэчы запакаваны, выдаюць за кампрамат. Але ж я гаспадыня, хто можа мне ўказваць, як захоўваць сваю маёмасць?

## Лёс вызначаць органы апекі

Ёсць у гэтай гісторыі яшчэ адзін важны момант. Нядаўна пенсіянерка прыватызавала кватэру. Дакументы — па яе даверанасці — афармляў былы сусед і сябар бабулі Аляксей. Грошы за прыватызацыю Клаўдзія Нікандраўна ўносіла свае.

У органах апекі пра гэту працэдуру ведалі. І ў сваім звароце ў пракуратуру нават напісалі, што падазроныя грамадзяне хочуць скарыстацца станам жанчыны і падманным шляхам завалодаць кватэрай. Так гэта ці не так, гадаць не будзем.

Цяпер жа, пасля прыватызацыі, яна зможа завяшчаць жыллё каму заўгодна (пры ўмове, што бабулю не прызнаюць недзеяздольнай). І калі раптам аб'явяцца сваякі, то ў іх будзе права прэтэндаваць на гэтыя метры.

Кропка ў гэтай справе яшчэ не пастаўлена. Суд пакуль прызначыў амбулаторна-камісійную судова-псіхіятрычную экспертызу, якую мусяць правесці незалежныя спецыялісты. Органы апекі, праўда, былі супраць. Маўляў, навошта яшчэ раз траціць дзяржаўныя грошы, ёсць жа заключэнне ўрачоў.

Па словах **адваката бюро «Права і сямейная медыяцыя» Наталлі ЯФІМЧЫК,** суд не можа змясціць пенсіянерку ў інтэрнат — ён толькі прымае рашэнне аб яе дзеяздольнасці. Калі ўсё ж Клаўдзію Нікандраўну прызнаюць недзеяздольнай, далейшы лёс яе будуць вызначаць органы апекі і папячыцельства. Але там, здаецца, ніякія варыянты, апроч накіравання ў псіханеўралагічны інтэрнат, не разглядаюць. Хоць у тэорыі бабулі могуць дазволіць жыць у кватэры, калі хтосьці з блізкіх аформіцца апекуном і будзе яе даглядаць.

Сама Клаўдзія Нікандраўна, якая, вядома, у сілу свайго ўзросту ўжо мае патрэбу ў дапамозе, але адказвае за свае дзеянні, спадзяецца на лепшае. Яна чакае сваё любімае свята — 9 Мая. І хоча сустрэць Дзень Перамогі ў родных сценах.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

---

■ Неасабісты суб'ектыў



# ДАРОГА ДА ХРАМА

## «Прыхаджане» — тыя, што прыйшлі і пайшлі?

МАЮ маму на мінулым тыдні абакралі... у царкве. Ідучы да прычасця, яна паставіла сумку на лаўку ля сцяны. Нехта выцягнуў адтуль кашалёк (у якім было ўсяго дзесяць тысяч і пенсійнае пасведчанне) і пальчаткі — тэкстыльныя, але падобныя на скураныя. Тэлефон, на шчасце, быў у кішэні.

Як звычайна бывае, калі нешта ўкрадуць або згубіш, мы доўга не маглі паверыць у такую неспадзяванку. Разоў дваццаць перетрэслі сумку, «пацярпелая» крок за крокам, секунда за секундай аднаўляла ў памяці свой паход на споведзь. Выснова была несуцяшальная: рэчы сапраўды прапалі, і прапалі менавіта ў царкве з зашпіленай сумкі...

Назаўтра мая Васілеўна зноў патэпала ў царкву — ужо без сумненняў, але з надзеяй, што, парушыўшы восьмую Божую запаведзь прама ў храме, злодзей усё ж верне хаця б дакумент. Надзея аказалася марнай, але затое ад кабеты, што прадае свечкі, давялося пачуць цэлую лекцыю аб прафілактыцы правапарушэнняў: маўляў, за сваімі рэчамі трэба пільна сачыць усюды, ну і што, што царква, — сюды ўсякія людзі ходзяць, гэта тут ужо не першы выпадак, нават бацюшка кажа, што ёсць вернікі, а ёсць прыхаджане — тыя, што прыйшлі і пайшлі...

Мы пасля доўга пра гэта разважалі. Скрадзенага было не шкада, невялікая страта, а калі б і вялікая — усё роўна не вернеш. Гаварылі больш пра людзей — пра сорам, сумленне, грэх, урэшце, якога не баяцца. Пра тое, што, ступіўшы гадоў трыццаць назад на дарогу да храма, амаль усе мы так і засталіся на пункце адліку, не зрабіўшы ніводнага кроку наперад. Бо з таго часу, як хадзіць у царкву або касцёл стала можна, людзі не сталі дабрэйшымі, не сталі больш клапаціцца пра бліжняга, менш хлусіць і здраджваць — і ў вялікім, і ў паўсядзённым.

РАНЕЙ, калі вера была фактычна забароненая, яна была своеасаблівай «лакмусавай паперкай» для кожнага. З нашай вялікай па тым часе вёскі ў касцёл у Ракаве ездзіла (а то й хадзіла пешкі за пятнаццаць кіламетраў) адна бабка Марылька, якую ўсе лічылі крыху вар'яткай. Яно, можа, і сапраўды так было, але, калі вясковую святыню — абраз святога Роха — стараннямі мясцовых актывістаў-атэістаў абклалі падаткам, менавіта Марылька забрала яго і плаціла са сваёй мізэрнай пенсіі даволі значную суму за тое, што ён стаяў у яе хаце. Менавіта дзякуючы гэтай дзівакаватай бабулі, што спявала раніцай на ганку малітвы і кожную нядзелю кіравалася з хатулькам на Ракаў, абраз і сёння ахоўвае вёску ад няшчасцяў, а мясцовыя кабеты аспрэчваюць права трымаць святыню ў сябе ў хаце — сёння гэта надзвычай пачэсна...

Цяпер жа схадзіць у храм стала справай паўсядзённай і звычайнай. (Не хачу пакрыўдзіць тых, хто сапраўды шчыра верыць, але для большасці гэта сапраўды так.) Прыйшоў, паставіў свечку, пачытаў малітву (не трэба нават і на памяць ведаць, каля кожнай іконы тэкст на сцяне вісіць) — усё, місія выканана. Можна жыць далей так, як лічыш патрэбным, не зважаючы ні на Бога, ні на людзей.

Я добра ведаю маці аднаго такога «прыхаджаніна». Хадзіць у царкву ён прызвычаіўся ў калоніі, дзе адбываў немалы тэрмін за гандаль наркотыкамі. Вызваліўшыся, вярнуўся да жонкі, але тая доўга не вытрымала і выставіла яго з хаты. Цяпер жыве ў маці — яна не выганіць. У хворай немаладой жанчыны сваімі выбрыкамі ён забірае апошняе здароўе. Пры гэтым штодня ў царкве б'е зямныя паклоны. Святар, да якога бедная маці хадзіла шукаць паратунку, абяцаў пагаварыць з хатнім тыранам, але даволі рэзонна заўважыў, што ў царкву ён яму хадзіць забараніць не можа, а ўсё астатняе — справа ўласна сумлення.

...Я помню свой першы сапраўдны Вялікдзень. Гэта калі да яго абавязковых атрыбутаў — булак і фарбаваных яек, якія былі заўсёды ў кожнай, нават зусім «камуністычнай» сям'і, дадалося нешта вельмі-вельмі важнае, сэнс, яшчэ не зусім зразумелы, але надзвычай значны. Быў 1989 год, і мясцовыя жанчыны нанялі аўтобус, каб з'ездзіць асвяціць велікоднае ў касцёле ў Рубяжэвічах (у нас у вёсцы большасць каталікоў). Пабралі з сабой і нас, маладзенькіх дзяўчат, каб паглядзелі на ўрачыстасць — гэта быў першы «афіцыйна дазволены» Вялікдзень, і людзей з наваколля мелася быць шмат.

І ўсё сапраўды было дзівосным: і дарога праз красавіцкую смугу, і сонца, якое павольна ўзыходзіла з-за пагорка, яе рассейваючы, і крыж на вільчыку касцёла, на якім, нікога не баючыся, радасна клекатаў бусел, і прадчуванне нечага надзвычай добрага і светлага. І галоўнае — твары людзей, дзясяткі, можа, нават сотні твараў, на якіх таксама было гэта прадчуванне, якія самі былі добрыя, светлыя — такія, што раптам паверылася: ужо заўтра свет вакол стане лепшым і дабрэйшым, бо мы сталі на шлях, які да гэтага вядзе...

Я ведаю: гэта было — сапраўднае. Але гэтага мала. Бо дарогу адолее той, хто ідзе. І тут кожны сам за сябе. І Бог нам суддзя.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
3
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# У ЦЁМНЫ ЛЕС... ПА СВЕТЛЫ НАСТРОЙ!

## Гульня «ў камушкі», музей шапавальства і песні для сватоў

**Выпраўляючыся ў этнаграфічную вандроўку, ніколі не ведаеш, што цябе напаткае. Песні і гульні, мясцовыя абрады і павер'і, дасціпны гумар і прыемныя знаёмствы. Усё гэта было і ў чарговай экспедыцыі здымачнай групы праграмы «Наперад у мінулае», што выходзіць у эфіры тэлеканала «Беларусь 3». На гэты раз каманда (а з ёй — і карэспандэнтка «Звязды») выправілася ў вёскі Цёмны Лес і Пакуцце Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Падчас паездкі мы пазнаёміліся з мясцовым клубам «Залаты ўзрост», навучыліся гуляць «у камушкі» і наведалі незвычайны музей-майстэрню шапавальства. Тэлепраграма выйдзе ў эфір у маі, а пакуль — некаторыя цікавінкі.**



Цемналескі клуб «Залаты ўзрост».

### РАНЕЙ ТУТ БЫЎ ГУШЧАР...

Больш як сто гадоў таму сем добрых сяброў і працавітых гаспадароў выправіліся ў свет шукаць сваё шчасце. І знайшлі яны яго на землях, купленых у паняў Епіфанавай і Курманаўскай. Надзел знаходзіўся сярод дрымучых лясоў Дрыбіншчыны. Тут гаспадары збудавалі хаты, пачалі гадаваць свойскую жывёлу і рупліва працаваць. Так паступова вырасла невялікая вёсачка, якая атрымала сімвалічную назву Цёмны Лес. Някепска жылі цемналесцы, таму неўзабаве сюды ў пошуках лепшай долі прыехалі і іншыя жыхары.

У 1897 годзе ў вёсцы было 5 двароў, жылі 19 чалавек, а ўжо праз 12 гадоў, у 1909 годзе, Цёмны Лес стаў пасёлкам з 13 двароў. Праз некаторы час пачалі працаваць лесапільны завод і млын, а ў 1916 годзе пачалі будаваць чыгунку. Той непраходны гушчар і стаў асноўным кармільцам для цемналесцаў. І таму сёння, прыехаўшы ў вёску, не давядзецца блукаць па лесе: ён адступіў далёка ад хат вяскоўцаў.



Гульня «ў камушкі».

Але працавітасць, стараннасць мясцовых жыхароў засталіся нязменнымі. Вось ужо шмат гадоў пры Цемналескім сельскім клубе існуе суполка «Залаты ўзрост». Жанчыны — а некаторыя з іх ужо дасягнулі і сапраўды паважанага ўзросту — з задавальненнем выступаюць у родным Цёмным Лесе, даюць канцэрты ў райцэнтры і наведваюць маланаселеныя вёскі. У рэпертуары гурта — як вядомыя песні, што ўжо сталі «фолкхітамі», так і адметныя мясцовыя спевы, танцы і нават гульні.

Давайце знаёміцца бліжэй.

### «ВЁСКА МАЛАДАЯ, А МЫ СТАРЫЯ»

Сяброўкі клуба «Залаты ўзрост» кажуць, што ў іх рэпертуары мала старажытных песень. Яны ўсе больш сучасныя, пазаабрадавыя, якія помняцца ім самім з маленства ці некалі былі пачуты ад маці, бабулі. Прычыну такой неглыбокай песеннай вандроўкі ў мінулае тлумачаць жартам: «Вёска маладая, а мы старыя». І сапраўды, Цёмнаму Лесу крыху больш за сто гадоў.

Ёсць тут і мясцовыя варыянты фолк-хітоў. Напрыклад, вядомай песні і танца «Сямёнаўна». Жанчыны з задавальненнем не толькі спяваюць, але і танчаць на сцэне пад гармонік!

**Сват ні ў якім разе не павінен быў крыўдаваць на дасціпныя жартоўныя прыпеўкі.**

З больш старажытных старэйшыя ўдзельніцы гурта хутка ўспомняць песні вясельныя. Раней у Цёмным Лесе вяселле святкавалі тры дні. Усе мелодыі спеваў для гасцей, для маладых — рытмічныя і вясёлыя. А для сватоў — поўныя насмешак, нават з'едлівага гумару. Тут прынята было жартаваць са сватоў, асабліва свата, а сам ён ні ў якім разе не павінен быў крыўдаваць на такія дасціпныя прыпеўкі: «А сват-сваце наплёў лапці з белых лык... ходзіць, як індык», «Сваточак наш Рона / Сядзіць, як варона...». Ну а вось гэтая прыпеўка зусім не крыўдная, наадварот — вясёлая і прыемная:

*А ў нашага свата*
*Вясёлая хата.*
*Бычкі ў смычкі граюць*
*Пад цёркі-свісцёлкі,*
*Бараны — у варганы,*
*Конікі — у гармонікі.*

На вяселлі ў сватоў прынята было прасіць падарункі «за маладую», гэта таксама суправаджалася жартамі:

*Сваточак ты наш дарагі,*
*Нясі гаршочык медавы.*
*Мы з твайго гаршочка не з'ядзім*
*Толька ў донышка паглядзім.*

Спявачкі шкадуюць, што ў наш час вяселлі святкуюць у рэстаранах, народных прыпевак не спяваюць, ды і ў цэлым вёска неяк раз'ядналася. А вось раней усіх лучыла не толькі песня, але і гульня «ў камушкі».

### ПАГУЛЯЕМ?

Нават сёння, праз столькі гадоў, жыхаркі Цёмнага Лесу не страцілі спрыту ў гэтай незвычайнай гульні. Яна развівае лоўкасць, дробную маторыку пальцаў, каардынацыю, а значыць — станоўчым чынам уздзейнічае і на мозг.

З гульнёй «у камушкі» нас пазнаёміла **спявачка «Залатога ўзросту» Зінаіда ТАРБАРАВА**:

— Кожны год, як толькі пачыналася вясна, мы ўсе, тады яшчэ школьнікі, ішлі па агародах збіраць «камушкі». У кожнага быў свой набор з пяці «камушкаў». Прыходзілі са школы, адразу паліто пад дошку — і гуляць. Гулялі і старыя, і малыя. Усе разам, нават старэнькія бабкі — такія, як мы сёння — са школьнікамі. Садзімся ў кола і дамаўляемся, на які лік гуляем. Выйграе той, хто першы набярэ неабходную колькасць «балаў». Гуляеш, пакуль не «страцішся», не зробіш памылку. Тады ход пераходзіць да наступнага.

Спачатку трэба раскінуць «камушкі», а потым збіраць іх адмысловам чынам: спачатку два, потым тры, чатыры і ўсе пяць. Падкінуць усе пяць каменьчыкаў разам і старацца іх хуценька адначасова схапіць.

Дарэчы, строі, у якіх выступае «Залаты ўзрост», пашытыя не так даўно. Але, як расказала загадчыца Цемналескага сельскага клуба Валянціна Гоманава, яны выкананы ў адпаведнасці з узорамі адзення і галаўных убораў, характэрнымі для Дрыбіншчыны.

Мы ж кіруемся далей, у суседнюю вёску Пакуцце, каб пазнаёміцца з адметным рамяством мясцовасці — шапавальствам.

### ЗЯМЛЯ РАМЕСНІКАЎ

Сям'я Зюлікавых з Пакуцця займаецца ўладкаваннем сваёй аграсядзібы. Але гэта не проста месца адпачынку для турыстаў, а сапраўдны комплекс, дзе будуць прадстаўлены ramёствы: пчалярства, кавальства і, безумоўна, мясцовая «фішка», шапавальства — традыцыйнае мастацтва вырабу рэчаў з воўны.

Валіць валёнкі па традыцыі — мужчынская справа. Вось ужо пяць пакаленняў мужчын сям'і Зюлікавых займаюцца іх вырабам. Сёння галоўны шапавал — гаспадар сядзібы Валянцін Уладзіміравіч, яму дапамагаюць яго тата, а таксама сын і зяць. Майстар Уладзімір Зюлікаў, самы старэйшы ў сям'і, распавядае:

— З даўніх часоў Пакуцце лічылася краем рамеснікаў. Тут жылі бондары, кавалі, шапавалы. А ўсё з-за таго, што зямля ў наваколлі не вельмі ўрадлівая: працы прыкладалі шмат, але багатых ураджаяў ніколі не было. Нават прымаўка такая з'явілася: «Хто жыве на гліне — той век не загіне, а хто жыве на пяску — той есць па маленькім куску». Нам выпала жыць «на пяску».

Таму жыхары Пакуцця, каб пракарміць сям'ю, і шукалі прыбытковыя справы, рабілі, што ўмелі, а потым ездзілі па суседніх і больш далёкіх вёсках, нават у Заходнюю Беларусь, абменьвалі зробленыя рэчы на грошы ці прадукты. Адметны занятак мясцовых жыхароў — шапавальства. Уладзімір Маісеевіч адзначае, што колькі да яго ні прыязджалі вучыцца з іншых вёсак, ніхто так і не авалодаў майстэрствам дасканала.

### ЗАМЕСТ МУЗЕЯ — МАЙСТЭРНІ

Аграсядзіба Зюлікавых ужо сёння складаецца з некалькіх пабудоў. У адной са старажытных хат размясціўся невялічкі музей-майстэрня. Калі гаспадары набылі дом, знайшлі многа ўнікальных прадметаў. Ёсць тут жорны ад млына, драўляныя колы, маслабойкі, каромыслы, лава і стол, рознае гаспадарчае начынне. Папоўнію музейную калекцыю і ўласны гармонік Уладзіміра Маісеевіча, на якім, дарэчы, мужчына выдатна іграе.

Сапраўдная цікавінка сядзібы — старажытная часалка, машына, на якой чэшуць воўну для вырабу валёнак. Для Беларусі і сёння такія прыстасаванні — рэдкасць. Раней жа часаць воўну ехалі здалёк, многія кіламетры пераадольвалі. Калі гаспадары набылі гэтую незвычайную машыну (прывезлі аж з-пад Брэста), яна была ў вельмі кепскім стане, бо шмат гадоў не выкарыстоўвалася. Давялося разабраць механізмы да самых дробных дэталяў, два тыдні мылі-рамантавалі, але ўсё ж запусцілі.

Адметна, што машына ў сядзібе Зюлікавых можа часаць нямытую воўну: менавіта такая патрэбна для валення. Можна тут нарыхтоўваць і ўжо памытую воўну для іншых вырабаў.

У планах сям'і — падрыхтоўка працоўных майстэрняў, у кожнай з якіх будуць праходзіць майстар-класы для школьнікаў і турыстаў, сустрэчы з дэманстрацыяй адметных прадметаў. Гаспадары падкрэсліваюць, што гэта не музей, і ўжо сёння сюды завітваюць школьнікі з навакольных вёсак, вучацца працаваць з воўнай, разглядаюць старажытныя рэчы, знаёмяцца з пчалярствам і каштуюць бліны са смачным мёдам. Але галоўнае — дведваюцца пра тое, як жылі продкі, чым займаліся іх дзяды і прадзеды.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*
**Фота аўтара.**



На сядзібе Зюлікавых, што ў Пакуцці, можна пабачыць сапраўдныя рарытэты.

## Субота, 23 красавіка

### Беларусь 1

**6.25** Існасць.
**6.55, 21.40 Меладрама «Васількі». 1—2-я серыі.**
**8.30** Буйным планам.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10 Серыял «Сваты-2». 1-я серыя.**
**10.25** «50 рэцэптаў першага».
**11.20** Дача.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**13.10, 15.45 Меладрама «Не адпускай мяне».**
**15.15** Краіна.
**17.35 Меладрама «Памяць сэрца».**
**21.00** Панарама.
**1.00** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.55, 21.05** Тэлебарометр.
**7.00 Серыял «Класная школа».**
**7.30 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**9.25** «Занадта шмат хвастоў».
**10.00** Азбука смаку.
**10.35 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
**12.35 Кінааповесць «У бой ідуць адны «старыя».**
**14.15** «Бітва экстрасэнсаў. Апакаліпсіс».
**16.25** Капейка ў капейку.
**17.00** «Чалавек-невідзімка». Рэаліці-шоу.
**18.00 Баявік «Кілеры».**
**19.50** «Здзіві мяне». Талент-шоу.
**21.10 Выбар гледачоў. Баявік «Абрабаванне па-італьянску».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.15** Канцэрт гурта «Дрозды».
**1.00** Хачу ў тэлевізар!

### Беларусь 3

**8.00, 9.10, 14.00, 19.00** «Калейдаскоп».
**8.15, 13.05** «Размаўляем пабеларуску». Тэлевіктарына.
**8.20 «Казус Кукоцкага». Драма. «Смерці няма», заключная серыя.**
**9.25, 16.15 «Старыя-разбойнікі». Камедыя.**
**10.55** «Кацюша». Голас Перамогі». Пра лёс самай грознай зброі Вялікай Айчыннай вайны.
**11.20 «Гарачы снег». Драма.**
**13.35** «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта, празаіка, лексікографа Змітрака Бядулі.
**14.20** «Час кіно».
**14.25 «Бархан». Драма.**
**15.45** Да 30-годдзя чарнобыльскай катастрофы. «Адраджэнне». Перадача 8-я «Ці ёсць будучыня пасля Чарнобыля?» (заключная).
**17.40** Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Фелікс Дзяржынскі: няма імені страшнейшага за маё». Дак. фільм.
**18.20** «Сусветныя тайны». «Фелікс Дзяржынскі: няўжо нельга знішчыць пацукоў?» Дак. фільм.
**19.20 «Казацкая быль». Маст. фільм.**
**20.40** «Калыханка».
**21.00** «Джэйсан Стэтхэм. Чароўнасць крымінальнага аўтарытэту».
**21.40** «Лаянэл Рычы. Вяртанне дадому». Канцэрт.
**23.25** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.40, 23.20** PRO спорт. Навіны.
**7.50** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**8.20** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт. 1/4 фіналу.
**10.25, 16.55** Хакей. Еўрачэлендж. Беларусь — Швейцарыя.
**12.15, 21.00** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**14.00** Піт-стоп.
**14.30, 23.30** Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт. 1/2 фіналу.
**16.30** Футбол. На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
**19.10** Футзала. Чэмпіянат Беларусі. Шосты тур.
**20.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**12.00** «Разумніцы і разумнікі».
**12.45** «Адкрыццё Кітая».
**13.15** «Леанід Дзербянёў. «Гэты свет прыдуманы не намі...»
**14.10 Серыял «Абдымаючы неба».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.20** «Ералаш».
**17.45** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.45** «ДОстояние РЕспублики: Ілья Рэзнік».
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35** «Падмаскоўныя вечары».
**23.30** Да 125-годдзя кампазітара. «Пракоф'еў наш».
**0.30 Маст. фільм «127 гадзін».**

### СТБ

**6.20 «Студэнты». Серыял.**
**7.55 Маст. фільм «Толькі ты ды я».**
**9.30** «Часткі свету».
**10.00** «Дакументальны праект»: «Тайныя знакі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Дарагая перадача».
**11.45 «Салдаты 10». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 1.45 Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынаў».**
**15.30** «Вадзіць па-руску!»
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** «Канцэрт Міхаіла Задорнава».
**17.35** «Дзве зоркі» на СТБ».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Драма «Таленавіты містар Рыплі».**
**22.30** «Дакументальны праект»: «НЛА. Сакрэтныя матэрыялы».
**0.10 Маст. фільм «Пікавая дама: чорны абрад».**

### МІР

**6.00, 8.00** М/ф.
**7.30** «Саюзнікі».
**8.30** «Медыцынская праўда».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Няма праблем».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45, 0.00 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».**
**13.20** «Цяжар абеду».
**13.50 Маст. фільм «Джоні-Зубачыстка».**
**16.15 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
**21.25** «Трымайся, шоубіз!»
**21.55** Фестываль Аўтарадыё «Дыскатэка 80-х».
**23.30** «Дыяспары».
**2.35 Маст. фільм «Джоні-Зубачыстка».**
**4.30 Маст. фільм «Дзяўчына з характарам».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.45 Маст. фільм «Лекі для бабулі».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Правілы руху».
**12.10 Маст. фільм «Чалавек-амфібія».**
**14.15** «Асабістае. Максім Аверын».
**15.00** «Ха». Маленькія камедыі.
**15.35 Маст. фільм «Вецер у твар».**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**21.00 Маст. фільм «Непрыгожая Любоў».**
**22.40 Маст. фільм «Слёзы на падушцы».**

### НТБ—Беларусь

**5.50** «Астрапрагноз».
**5.55, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** Кулінарны паядынак.
**9.25** «Урачэбныя тайны плюс».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.00** «Кватэрнае пытанне».
**13.05** «Высоцкая Life».
**14.05** «Люстэрка для героя».
**15.05** «Наш космас».
**16.20 Серыял «Мент у законе».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч. Лёсы».**
**23.20 Серыял «Хмураў».**

### 8 канал

**9.00, 15.50, 19.00, 20.50, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.15 Серыял «Абараніць боса».**
**10.20, 10.45, 15.55, 18.50** «Хатняя крама».
**10.35** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.00 Мюзікл «Стылягі».**
**13.10 Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».**
**15.15** «Мультпарад».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**17.30 Маст. фільм «Дзеці шпіёнаў».**
**19.05 Камедыя «Дзевяць ярдаў».**
**20.45** «Вечарніца».
**20.55** «Фэшн is my прафэшн».
**21.10 Меладрама «Д'ябал носіць Prada».**
**23.00 Серыял «Штам».**

### ВТБ

**6.00, 9.30, 5.30** «Лаві момант».
**6.30** «Паспець за 24 гадзіны».
**7.30** М/ф «Ёка».
**7.45** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** «Ералаш».
**9.00, 15.00, 4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** «Хто каго на кухні».
**12.30** «Здаецца! З рамонтам».
**13.30** Трылер «Начны рэйс».



**15.30** «Уральскія пельмені».
**17.00** М/ф «Шрэк назаўсёды».
**18.30** «Два галасы».
**20.30** Фантастыка «Трансформеры 3: Цёмны бок Месяца».
**23.30** «Дзікія гульні».
**0.30** Скетчкам «Студэнты».
**3.30** «Дурні і дарогі».
**4.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Класіка жанру. Аркадзь Райкін».
**10.20** «Аляксандр Неўскі». Маст. фільм.
**12.05** 125 гадоў з дня нараджэння кампазітара. «Геніі. Сяргей Пракоф'еў».
**13.00** Пракоф'еву прысвячаецца... Валерый Гергіеў і Сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра — марафон да 125-годдзя кампазітара.
**15.00** «Звычайны чалавек». Маст. фільм.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Рамантыка раманса».
**18.25** 25 гадоў з дня нараджэння кампазітара. «Сяргей і Ліна Пракоф'евы».
**19.05** «Іван Грозны». Маст. фільм.
**22.05** «Лінія жыцця». Галіна Воўчак.
**22.55** Да 60-годдзя тэатра «Сучаснік». Спектаклі-легенды. Чулпан Хаматава, Аляксандр Хаванскі, Сяргей Юшкевіч, Сяргей Гірын, Тамара Дзегцярова ў спектаклі «Тры таварышы». Запіс 2005 года.
**1.55** «Горад на марскім дне». Дак. фільм.
**2.50** «Роберт Бэрнс». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. «Звукі Му». 2006 год. 1-я частка.
**7.00** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1990 год.
**7.05, 8.30, 9.40, 11.00, 11.30, 12.45, 14.20, 14.45, 15.40, 17.00, 19.00, 20.30, 23.30, 0.50, 2.30, 3.40. 5.00** Музычная настальгія.
**7.20** Маст. фільм «Над намі Паўднёвы крыж».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** Дак. фільм «Галіна Вішнеўская. Вяртанне».
**13.00** Маст. фільм «Капель».
**14.40** «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1960 год.
**16.00** «Колба часу».
**18.00** «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Трыа «Меридиан» і Вольга Кармухіна. 2007 год.
**19.20** «Зямля—Паветра». Дэцл. 2003 год.
**21.00** «Быў час». 2010 год.
**22.00** Маст. фільм «Дзёрскасць».
**0.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно...» Леанід Уцёсаў.
**1.30** Маст. фільм «Усюды ёсць неба».
**2.45** М/ф «Хто атрымае ананас?».

### EuroSport 1

**4.00** Веласпорт. Тур Фландрыі.
**5.00** Веласпорт. Парыж — Рубэ.
**6.00** Веласпорт. Гонка Amstel Gold.
**7.30, 10.30, 12.00, 15.00, 19.45, 21.00, 2.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**9.30, 1.15** Веласпорт. Тур Харвата.
**0.05** Конны спорт. Global Champions Tour.

### Камедыя

**1.00** Камедыя «Муж дзвюх жонак».
**2.40** Камедыя «Усмешка Бога, або Чыста адэская гісторыя».
**5.00** Камедыя «Кухар на колах».



**7.00** Камедыя «Два светы».
**8.55** Меладрама «Каханне — гэта для дваіх».
**10.45** Камедыя «На здрадзе».
**12.20** Камедыя «Лілі Давід».
**14.00** Меладрама «Сняданак у ложак».
**15.40** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Цяжарны».
**17.40** Камедыя «Мытня дае дабро».
**19.40** Камедыя «Госць».
**21.15** Камедыя «Карсіканец».
**22.55** Камедыя «Вялікае вяселле».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**9.45** «Сардэчна запрашаем дадому!»
**10.35** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.30** «Доказ віны».
**12.20, 1.25** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.50** «Элвін і бурундукі 2». Камедыя.
**17.30** «10 самых».
**18.05** «Трынаццаць знакаў Задыяка».
**19.10** «Дамавы». Трылер.
**21.15** «Экстрасэнсы супраць вучоных».
**22.15** «З Парыжа з любоўю». Баявік.
**23.55** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Куміры. Назад у СССР». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.15** Меладрама «Шоўк».
**8.10, 3.55** Меладрама «Трэцяя персона».
**10.30, 2.15** Меладрама «Даю год».
**12.15** Драма «Філамена».
**14.05** Меладрама «Еш, маліся, кахай».
**16.30** Камедыя «Мая жудасная нянька».
**20.10** Драма «Абяцанне».
**22.10** Драма «Падмена».
**0.35** Меладрама «Цяжкасці перакладу».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20, 18.35** Трагікамедыя «Маска ніколі не спіць».
**8.20, 2.05** Меладрама «Падарожжа са свойскімі».
**10.10, 4.05** Драма «Танкер «Танга».
**12.20** Камедыя «Утаймавальнікі веласіпедаў».
**13.40** Драма «Ахоўвай мяне, мой талісман».
**15.10** Камедыя «Пах верасу».
**17.00** Трылер «Уцекачы».
**20.20** Драма «Нябесны суд».
**22.20** Меладрама «Гараскоп на ўдачу».
**0.20** Драма «24 гадзіны».

### National Geographic

**6.00, 13.35, 5.35** Гульні розуму.
**6.50** Займальная навука.
**7.35, 17.50** Каралі шахт.
**8.20, 10.00** Незвычайныя промыслы.
**9.10** Золата Юкана.
**10.45** Дзікі тунец.
**11.35** Шаша праз пекла.
**12.20** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**13.10, 0.40, 3.45** Навуковыя недарэчнасці.
**14.00** Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
**15.30** Інстынкт выжывання.
**16.20** Білі Кід: новыя доказы.
**19.30** Сапраўдны суперкар.
**21.00, 0.55** Дзікае надвор'е.
**21.45, 1.40, 4.00** Землетрасенне на Эверэсце.
**22.35, 2.30, 4.50** Жах у нябёсах.
**23.20** У пошуках праўды.
**0.10, 3.15** Код небяспекі.

### Discovery

**8.00** Траса Калыма.
**9.00, 22.00** Востраў.
**10.00** Паляўнічыя на атруту.
**11.00, 4.40** Ліквідатар.
**12.00** Скарбы з каморкі.
**13.00** Паляўнічыя на старызну.
**14.00** Мяцежны гараж.
**15.00, 23.00, 2.55, 6.20** Браты Дызель.
**16.00, 5.30** Мотарэстаўрацыя.
**17.00** Выжыць разам.
**0.00, 7.10** Даліны смерці.
**1.00** Аляска: апошні рубеж.
**2.00** Курс выжывання.
**3.50** Выжыць у дзікіх умовах.

## Zамор'е

### ПРАПАНАВАЎ РУКУ, АЛЕ ЗАВІС

**У літаральным сэнсе. Жыхара амерыканскага штата Каліфорнія, які забраўся на скалу, каб зрабіць прапанову сваёй дзяўчыне, давялося ратаваць на верталёце.**



27-гадовы Майкл Джон Пол Бэнкс падняўся на 180-метровую скалу Мора, каб пагаварыць з каханай праз праграму з функцыяй відэазванкоў. Пасля таго, як яна адказала згодай, амерыканец паспрабаваў спусціцца ўніз, але апынуўся ў пастцы. Паводле слоў супрацоўніка пажарнай службы Тода Гэйлі, калі ён прыбыў на месца здарэння, Бэнкс стаяў на беразе 24-метровага абрыву. Пажарныя спусціўся з верталёта на тросе, прывязаў небараку да сябе і даставіў жаніха на зямлю.

Гэта не першая спроба здзівіць дзяўчыну прапановай рукі і сэрца. У студзені 2016-га прадстаўнік Абсалютнага байцоўскага чэмпіянату (UFC) Алекс Нікалсан стаў на адно калена падчас афіцыйнай працэдуры ўзважвання перад боем. Выбранніца 25-гадовага спартсмена Ханна Голд, якая таксама з'яўляецца прафесійным байцом, адказала згодай.

### ПЧОЛ КРАДУЦЬ МІЛЬЁНАМІ

**Італьянскі пчаляр Марыа Берці прапанаваў узнагароджанне таму, хто дапаможа яму вярнуць каля 1,2 мільёна скрадзеных пчол, паведамляе The Local.**

77-гадовы мужчына, які пражывае ў камуне Каравіна, звярнуўся ў паліцыю. Паводле яго слоў, крадзеж быў учынены ноччу і нагадваў сабой «добра спланаванае злачынства». Усяго ў Берці выкралі 17 вулляў, у кожным з якіх пражывала па 70 тысяч пчол. Пчаляр сцвярджае, што шкода склала каля пяці тысяч еўра. Ён таксама адзначыў, што такі маштабны крадзеж вельмі негатыўна адаб'ецца на яго бізнесе. Берці прызнаўся, што з яго фермы і раней знікалі вуллі, але ён не звяртаўся ў паліцыю ў сувязі з нязначным памерам крадзяжоў.

### П'ЯНЫХ КІРОЎЦАЎ — У МОРГ

**Не палохайцеся, гэта не страшная статыстыка і не заклік. Проста ўлады Тайланда задумаліся пра тое, каб накіроўваць валдзіцеляў, якіх злавілі п'янымі за рулём, на працу ў морг. Гэта павінна стаць часткай пакарання, якое прызначаецца ў выглядзе абавязковых грамадскіх работ.**



Ідэя заключаецца ў тым, каб такія кіроўцы цвёрда ўсвядомілі, якімі могуць быць наступствы кіравання аўтамабілем у стане ап'янення. Цяпер парушальнікаў прымушаюць, напрыклад, займацца высечкай дрэў або прыбіраннем вуліц. Некаторых накіроўваюць у бальніцы даглядаць пацярпелых у ДТЗ. Колькасць п'яных кіроўцаў, якіх затрымліваюць падчас якіх-небудзь святочных мерапрыемстваў, працягвае расці. Прапанова наконт працы ў моргу цяпер разглядаецца ўрадам. Тайланд займае першае, самае высокае ў Азіі, і другое ў свеце месца па паказчыках смяротнасці на дарогах. А ініцыятыва, цалкам магчыма, і працверазіла б некаторых аматараў зялёнага змея. Дарэчы, не толькі ў Тайландзе.

**Іван КУПАРВАС.**

## ДАБРОМ ЗА ДАБРО

**Жыхар французскага горада Доль прадаў заснаваную ім пякарню мясцоваму бяздомнаму за сімвалічную суму ў адзін еўра.**



У снежні 2015 года 62-гадовы Мішэль Фламан *(на фота справа)* ледзь не загінуў ад атручвання чадным газам. Тады мужчыну дапамог 37-гадовы бяздомны Жэром Акан, які патэлефанаваў у службу ратавання і тым самым выратаваў жыццё пекару. Паводле слоў пацярпелага, газ пачаў распаўсюджвацца па памяшканні з-за няспраўнасці ў хлебнай печы. Калі прадпрымальнік вярнуўся з бальніцы, то ў якасці падзякі наняў бяздомнага на працу. Фламан адзначыў, што Акан хутка навучыўся рамяству і добра спраўляўся з абавязкамі. Тады пекар прыняў рашэнне прадаць бізнес здольнаму вучню. «Мяне цікавяць не грошы, а свабода. Я хачу адпачыць, і навошта сабе адмаўляць, калі змагу зрабіць гэтым шчаслівым яшчэ і Жэрома», — сказаў Фламан.

## ПАЗНАЮ МІЛАГА ПА НОСЕ

**Кажуць, што кітайцы ўсе на адзін твар, але яны думаюць тое ж пра еўрапейцаў. Частка праўды тут ёсць, і даволі вялікая. Напрыклад, як у выпадку, калі ажаніліся дзве пары блізнят. І пераблыталіся! А каб перастаць гэта рабіць, блізняты-маладыя адважыліся на пластычную аперацыю.**



Гісторыя пачалася праз два месяцы пасля шлюбу — калі высветлілася, што Юн Фэй, Юн Ян і іх мужы Чжао Сінь і Чжао Сюань неаднаразова выходзілі «ў свет» з чужымі палавінкамі. Пакуль усё абмяжоўвалася нявіннымі розыгрышамі, але каб у будучыні выпадкова «не перайсці рысу», пары вырашылі змяніць сваю знешнасць. Маладыя людзі нарадзіліся і выраслі ў суседніх вёсках кітайскай правінцыі Шаньсі. Акрамя неверагоднага вонкавага падабенства, у братоў і сясцёр вельмі падобныя галасы і міміка. Іх не могуць адрозніць нават сябры і сваякі. Пластычныя хірургі паабяцалі дапамагчы закаханым бясплатна. Параіўшыся з урачамі, маладыя вырашылі змяніць ілбы і насы.

## ВЫПУСКНІЦЫ — 102 ГАДЫ

**Жыхарка штата Кентукі (ЗША) скончыла ўніверсітэт Брэшыя праз 60 гадоў пасля таго, як пачала наведваць заняткі.**



Сесілія Мішэль Баармен паступіла ў навучальную ўстанову ў 1957 годзе. Тады жанчыне было 40 гадоў, і яна займалася разам са сваёй дачкой, вучылася ў тым жа ўніверсітэце. Не скончыўшы навучанне, Баармен прыйшлося з'ехаць з Кентукі ў штат Арызона. Ёй так і не ўдалося вярнуцца да студэнцкага жыцця. Дачка пенсіянеркі расказала супрацоўніцы адміністрацыі ўніверсітэта пра тое, што яе маці спаўняецца 102 гады, а яна так і не атрымала вышэйшую адукацыю. Тады кіраўніцтва прыняло рашэнне выдаць бабулі дыплом аб заканчэнні Брэшыі. Пасля атрымання дакумента амерыканка стала найстарэйшай з выпускнікоў установы.

# Нядзеля, 24 красавіка

### Беларусь 1

**7.10 Меладрама «Васількі». 2-я серыя.**
8.50 Слова Мітрапаліта Паўла на свята Уваходжання Гасподняга ў Іерусалім (Вербная нядзеля).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.40 Серыял «Сваты-2».**
10.55 «50 рэцэптаў першага».
11.45 Нашы.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «Зваротны білет».**
14.25 Каробка перадач.
15.15 Твой горад.
15.30 Eurovision. Вынікі тыдня.
15.50 Вакол планеты.
16.35 Тайны следства.
**17.10 Меладрама «Два Іваны».**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
22.10 Клуб рэдактараў.
**22.50 Меладрама «Прымета на шчасце».**

### Беларусь 2

7.05, 14.20, 21.05 Тэлебарометр.
**7.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**8.40 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».**
10.40 «Універ-шэф».
11.20 Ваша лата, Пяцёрачка.
11.50 «Lady Блог». Модны праект.
**12.30 Серыял «Шчаслівыя разам».**
**14.55 Баявік «Кілеры».**
**16.45 Баявік «Абрабаванне па-італьянску».**
**18.50 Баявік «Лара Крофт: Раскрадальніца грабніц. Калыска жыцця».**
**21.10 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
22.00 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
22.10 Хачу ў тэлевізар!
**22.15 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

8.00, 14.45 «Калейдаскоп».
8.15, 15.00, 23.20 «Размовы пра духоўнае».
8.25 М/ф.
**8.50 «Пад 12-мільным рыфам». Прыгоды.**
10.30 «Подых струн».
11.10 «Наперад у мінулае».
11.40 Хіт-парад «Сто песень для Беларусі».
12.30 «Музеі Беларусі». Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі.
13.00 «Святыні Беларусі». Ракаўская Свята-Праабражэнская царква.
13.25 Леанід Млечын прадстаўляе. «Сусветныя тайны». «Фелікс Дзяржынскі: няма імені страшнейшага за маё». Дак. фільм.
14.05 «Сусветныя тайны». «Фелікс Дзяржынскі: няўжо нельга знішчыць пацукоў?» Дак. фільм.
15.10 «Гітара па крузе». Аўтар-выканаўца Сяргей Бай.
16.05 «Камертон». Народны артыст Расіі Станіслаў Гаварухін.
**16.35 «Варашылаўскі стралок». Драма.**
18.10 «Кіно і час». Катастрофа на Чарнобыльскай АЭС.
**18.50 «Снягі Кіліманджара». Драма.**
20.40 «Калыханка».
21.00 «Песня, мая песня. Алег Іваноў». Канцэрт.
**21.55 «Шчыра Ваш...» Камедыя.**

***На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай вобласці з 18 па 22 красавіка на працягу адной гадзіны будуць трансліравацца абласныя тэлепраграмы:***
*панядзелак, аўторак, чацвер, пятніца — з 18.55 па 19.55; серада — з 18.50 па 19.50.*

### Беларусь 5

7.40, 23.05 PRO спорт. Навіны.
7.50 Футбол. На шляху да Еўра-2016. Відэачасопіс.
8.20 Хакей. Еўрачэлендж. Беларусь — Швейцарыя.
10.10 Формула-Е. Гран-пры Францыі.
11.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Ліверпуль» — «Ньюкасл».
13.15 Хакей для ўсіх.
14.00 Авертайм.
14.30 Тэніс. Турнір WTA. Штутгарт. Фінал.
16.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
16.55 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Калеў» — «Цмокі-Мінск».
18.45 Час футбола.
18.55 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама-Мінск».
21.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Суонсі».
23.15 Баскетбол. НБА. Плэй-оф.

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
11.20 «Голас. Дзеці».
13.10 «Угадай мелодыю».
13.55 «Госці па нядзелях».
14.55 «Леў Прыгуноў. Джэймс Бонд Савецкага Саюза».
16.15 Навіны спорту.
**16.20 Дэтэктыў «Карчма на Пятніцкай».**
18.00 «Без страхоўкі».
20.00 Контуры.
21.05 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
23.10 «Што? Дзе? Калі?» Вясновая серыя гульняў.
0.15 «Кранштат 1921».

### СТБ

**6.15 «Студэнты». Серыял.**
7.05 «Самая карысная праграма».
7.55 «Скардзіцца дазваляецца».
8.15, 16.50 «Аўтапанарама».
**8.40 Драма «Таленавіты містар Рыплі».**
11.00 «Вялікае снеданне».
**11.40 «Салдаты 10». Серыял.**
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.40, 1.00 Маст. фільм «Даґракі».**
15.10 «Канцэрт Міхаіла Задорнава».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Военная тайна».
19.30 «Тыдзень».
**20.25 Драма «Чатыры пёры».**
22.45 «Нам і не снілася».

### МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.15, 8.35 М/ф.
8.05 «Нітка да ніткі».
9.00 «Культпрасвет».
9.30 «Чаму я?»
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Правы на памылку».**
**13.45 Маст. фільм «Дзікая штучка».**
15.30 «Трымайся, шоубіз!»
**16.15, 22.00 Серыял «Свірыдавы».**
21.00 «Разам».
**0.10 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».**
5.05 Дак. фільм «З нагоды».

### РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Слёзы на падушцы».**
11.00, 14.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.35 «Ранішняя пошта».
13.10 «Мая планета».
**14.15 Маст. фільм «Каханне не дзеліцца на 2».**
17.35 «Танцы з зоркамі».
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
22.30 «Смяяцца дазваляецца».
23.50 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Сужэнцы».**
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.50 «Іх норавы».
9.25 «Ядзім дома».
10.25 «Першая перадача».
11.05 «Цуд тэхнікі».
12.00 «Дачны адказ».
13.05 «НашСпажыўНагляд». Не дай сябе падмануць!
14.15 «Паедзем, паядзім!»
15.05 «Наш космас».
**16.20 Серыял «Мент у законе».**
18.10 «Следства вялі...»
19.00 «Акцэнты тыдня».
**19.55 Серыял «Горы, якія страляюць».**
**23.10 Серыял «Хмураў».**

### 8 канал

9.00, 15.20, 19.05, 23.50 «Надвор'е».
9.05, 15.25 «Мультпарад».
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 15.10, 16.45, 21.00 «Хатняя крама».
10.45 «Мой любімы гадаванец».
**11.15 Серыял «Камісар Рэкс».**
**13.00 Драма «Целаахоўнік».**
16.15 Дак. фільм «Вербная нядзеля».
**17.15 Серыял «Чыста англійскае забойства».**
**19.10 Драма «Шостае пачуццё».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Прыгоды «У дзікіх умовах».**

### ВТБ

6.00, 4.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
6.30 «Здаецца! З рамонтам».
7.30 М/ф «Ёка».
7.45 М/ф «Смяшарыкі».
8.00 М/ф «Маша і мядзведзь».
8.30, 13.00 «Ералаш».
9.00 «Хто каго на кухні».
9.30, 3.30 «Лаві момант».
10.00, 1.00 «Турбамайсцер».
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».
13.30 М/ф «Шрэк назаўсёды».
15.00 «Два галасы».
17.00 Фантастыка «Трансформеры 3: Цёмны бок Месяца».
19.30 «Уральскія пельмені».
21.00 Фантастыка «Трансформеры: Эпоха вынішчэння».
0.00 «Кіно ў дэталях».
4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
5.30 «Дурні і дарогі».

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Лета Гасподняе». Вербніца.
10.35 «Знаёмцеся, Балуеў». Маст. фільм.
12.10 «Легенды сусветнага кіно». Мак Сенет.
12.40 «Расія, любоў мая!» «На Таймыр да далганаў!»
13.05 Геніі і ліхадзеі. Мікалай Рэрых.
13.35 «Горад на марскім дне». Дак. фільм.
14.25 «Егудзі Мянухін. Скрыпач стагоддзя». Дак. фільм.
16.30 «Вяселле». Маст. фільм.
17.30 «Пешшу...» Масква кампазітарская.
18.00 «Блізкі круг Аляксея Барадзіна».
18.50, 1.55 «Шукальнікі». «Пакаянне» атамана Аненкава.
19.35 Юрыю Візбару прысвячаецца... Вечар бардаўскай песні.
20.50 «Той самы Мюнхгаўзен». Маст. фільм.
23.05 Пракоф'еву прысвячаецца... Валерый Гергіеў і Сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра — марафон да 125-годдзя кампазітара.
1.05 «Больш чым каханне». Сяргей Пракоф'еў і Ліна Кодзіна-Пракоф'ева.
1.45 «Бяседа». М/ф для дарослых.
2.40 Сусветныя скарбы.

### Настальгія

6.00 Дак. фільм «Галіна Вішнеўская. Вяртанне».
6.50, 8.20, 8.45, 9.40, 11.00, 13.00, 14.35, 17.30, 18.40, 20.35, 22.10, 1.05, 2.35, 3.40. 5.00, 5.30 Музычная настальгія.
7.00 Маст. фільм «Капель».
8.40 «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1960 год.
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
12.00 «Народжаныя ў СССР». Найлепшае. Трыа «Мерыдыян» і Вольга Кармухіна. 2007 год.
13.20 «Зямля—Паветра». Дэцл. 2003 год.
15.00 «Быў час». 2010 год.
16.00 Маст. фільм «Дзёрзкасць».
18.00 «Акулы пяра». Багдан Цітамір.
19.20 «Зямля—Паветра». Група «Прэмьер-министр». 2003 год.
21.00 Маст. фільм «Дзе ты, Багіра?».



0.00 «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока. «Звуки Му». 2006 год. 1-я частка.
1.00 «Навіны дня. Хроніка нашых дзён». 1990 год.
1.20 Маст. фільм «Над намі Паўднёвы крыж».
4.00 «Народжаныя ў СССР».

### EuroSport 1

4.00 Веласпорт. Парыж — Рубэ.
5.00 Веласпорт. Гонка Amstel Gold.
6.00, 14.15 Веласпорт. Флеш Валонь.
7.30, 19.00, 21.00, 0.00 Снукер. Чэмпіянат свету.
9.00 «Спорт знутры».
9.30 Фехтаванне. Серыя Гран-пры.
11.00 Лёгкая атлетыка. Марафон.
15.00 Веласпорт. Льеж — Бастонь — Льеж.
18.00 Аўтаспорт. Серыя WTCC.
1.00, 2.30 Футбол. Чэмпіянат MLS.

### Камедыя

0.30 Камедыя «Неўпапад».
2.10 Камедыя «Чалавек-эльф».
3.50 Меладрама «Закахацца ў нявесту брата».
5.35 Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчаты».
7.10 Камедыя «Тарыф Навагодні».
8.45 Камедыя «Амаль замужам».
10.25 Камедыя «Вялікі Джым».
12.10 Камедыя «І не чырванее».
14.00 Камедыя «Імя».
16.00 Камедыя «Муж двух жонак».
17.45 Камедыя «Снежная нявеста».
19.20 Камедыя «Высакародны венецыянец».
21.15 Камедыя «Хачу як Брыджэт».
22.55 Камедыя «Усё ўключана 2».

### ТБ3

6.00 М/ф.
9.30, 23.20 «Вербная нядзеля». Дак. фільм.
10.25 «Паненка і кулінар».
11.00 «Далёка і яшчэ далей».
12.00, 1.45 «Куля-дурніца». Серыял.
15.10 «Жонка. Гісторыя кахання».
16.35 «Домік ля ракі». Дэтэктыў.
19.55 «Без падману».
20.50 «Я, робат». Фантастыка.
22.25 «Асцярожна, махляры!»
0.10 «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
4.40 «Лінія фронту». Дак. фільм.

### ТБ1000

6.10, 18.20 Драма «Філамена».
8.10, 2.05 Драма «Падмена».
10.40 Драма «Абяцанне».
12.25, 4.25 Меладрама «Цяжкасці перакладу».
14.15 Меладрама «Трэцяя персона».
16.35 Меладрама «Даю год».
20.10 Меладрама «Версальскі раман».



22.10 Драма «На самым дне акіяна».
0.10 Драма «Хлусня дзеля выратавання».

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20, 18.30 Камедыя «Тата напракат».
8.20, 2.50 Меладрама «Гараскоп на ўдачу».
10.20, 4.40 Драма «Нябесны суд».
12.20 Камедыя «Дэжа вю».
14.20 Меладрама «Падарожжа са сваёй жывёламі».
16.20 Драма «Танкер «Танга».
20.20 Прыгоды «Форт Рос: У пошуках прыгод».
22.10 Трагікамедыя «Коля — перакаці-поле».
0.10 Камедыя «Жанчыны супраць мужчын».
1.40 Драма «Ахоўвай мяне, мой талісман».

### National Geographic

6.00, 13.35, 5.35 Гульні розуму.
6.50 Займальная навука.
7.35 Золата ў халоднай вадзе.
8.20, 15.30 Інстынкт выжывання.
9.10 Незвычайныя промыслы.
10.45 Дзікі тунец.
11.35 Шаша праз пекла.
12.20 Міжнародны аэрапорт Дубай.
13.10, 0.40, 3.35 Навуковыя недарэчнасці.
14.00 Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
16.20 Каралі шахт.
17.50 Землетрасенне на Эверэсце.
18.40 Погляд знутры.
19.30, 22.35, 2.30, 4.50 Космас. Прастора і час.
20.10 Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
21.00, 0.55, 4.00 Даследчык 2.0.
23.20 Эвакуацыя Зямлі.
0.10, 3.15 Код небяспекі.

### Discovery

8.00, 15.00 Курс выжывання.
9.00, 17.00, 1.00, 5.30 Аляска: сям'я з лесу.
10.00 Выжыць у дзікіх умовах.
11.00, 4.40 Аляска: апошні рубеж.
12.00 Праклён ледзянога золата.
13.00, 20.00 Залатая ліхаманка.
14.00 Вострaў.
16.00, 0.00 Не спрабуйце паўтарыць.
21.00 Шэрпа.
23.00 А ты б выжыў?
2.00 Мяцежны гараж.
2.55 Паляўнічыя на старызну.
3.50 Паляўнічыя на агрусту.

# АД РУБРЫКІ ДА МАСТАЦКАГА ВЫДАННЯ

## Непаўторнасць паўднёвага рэгіёна прадстаўлена ў новай кнізе

**Газета «Гомельская праўда», якая цяпер з'яўляецца і выдавецкім домам, у Гомельскай абласной бібліятэцы прэзентавала новы фотаальбом «Гомельшчына ўнікальная». Ён выдадзены на трох мовах: беларускай, рускай і англійскай. Гэта (а яшчэ мастацкія фотаздымкі фотакарэспандэнтаў газеты) дае магчымасць раскрыць прыгажосць паўднёвай вобласці Беларусі для самага шырокага кола чытачоў. Галоўны рэдактар, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Сяргей БЯСПАЛЫ кажа, што энцыклапедыя роднага краю гадоў пяць таму пачыналася з рубрыкі «Музеі Гомельшчыны»:**




— Журналісты збіралі матэрыялы не толькі ў вядомых установах культуры. Яны паехалі ў глыбінку, пабывалі ў музеях школьных, вясковых... Ну а потым мы вырашылі, што трэба рыхтаваць асобнае вялікае мастацкае выданне. Гомельшчыне ёсць чым ганарыцца. Мы сабралі шмат цікавага матэрыялу, які пацвердзіў: наш край — гэта скарбніца ўнікальнай інфармацыі. Мы думаем, што фотаальбом, дзе сабраны здымкі, якія адлюстроўваюць усе сферы жыцця нашага рэгіёна, стане выдатным падарункам.

**Ірына ДАЎГАЛА, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама** адзначае, што многія праекты «Гомельскай праўды» здзейснены сумесна з аблвыканкамам:

— Раней мы выдалі кнігу, прысвечаную 75-годдзю Гомельскай вобласці, таксама гістарычнае даследаванне «Гомельская губернія. Невядомыя старонкі». Адным з маштабных сумесных праектаў стала кніга «Ніколі не забудзем», прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі. І цяпер вось — «Гомельшчына ўнікальная». Між тым да 30-годдзя чарнобыльскай катастрофы рыхтуецца да выпуску новы фотаальбом.

«Гомельшчына ўнікальная» выдадзена накладам тры тысячы асобнікаў. Па словах аўтараў, у мастацкім выданні сабраны найлепшыя фотаздымкі апошніх гадоў, кожны з іх падкрэслівае непаўторнасць і самабытнасць краю.

На прэзентацыі, праведзенай супрацоўнікамі Гомельскай абласной бібліятэкі, нагадалі, што на Гомельшчыне нарадзіліся і працавалі многія вядомыя дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, пісьменнікі, мастакі, музыканты, спартсмены, чые імёны праславілі нашу краіну далёка за межамі Беларусі: напрыклад, дыпламат Андрэй Грамыка, першы алімпійскі беларускі чэмпіён Леанід Гейштар. Гомельшчына — радзіма вялікага славянскага асветніка Кірылы Тураўскага. Пісьменнік Іван Шамякін пачынаў сваю дзейнасць у літаратурным аб'яднанні пры «Гомельскай праўдзе» і ніколі пра гэта не забываў. Літаратары Іван Навуменка, Андрэй Макаёнак і многія іншыя майстры слова маюць непасрэднае дачыненне да Гомельшчыны, і пра іх дзейнасць, зразумела ж, у свой час пісалі журналісты «Гомельскай праўды».

**Мікалай МЯЗГА, дэкан гістарычнага факультэта ГДУ імя Францыска Скарыны,** падкрэсліў, што сёння выданне з'яўляецца яшчэ і крыніцай для гісторыкаў-прафесіяналаў.

Між тым «Гомельская праўда» актыўна пашыраецца. Сёння гэта не толькі газета, але і інтэрнэт-партал, выдавецтва, рэкламнае і інфармацыйнае агенцтва. У найбліжэйшых планах — пачатак FM-вяшчання. А яшчэ супрацоўнікі «Гомельскай праўды» заканчваюць ствараць віртуальную версію — за ўвесь час існавання выдання. Значыць, з гістарычнымі публікацыямі газеты неўзабаве можна будзе пазнаёміцца і ў лічбавым фармаце.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*
**Фота аўтара**

# ПАМЯТАЕМ, СМУТКУЕМ...




**13 красавіка пасля цяжкай хваробы пайшоў з жыцця вядомы журналіст і пісьменнік Міхаіл Пятровіч КАЦЮШЭНКА.**

**Ён працаваў у газеце «Чырвоная змена», ЦК ЛКСМБ, у канцы 1970-х — пачатку 80-х узначальваў рэспубліканскую маладзёжную газету «Знамя юности», якая выходзіла тады велізарным тыражом. Потым у яго жыцці быў папулярны часопіс «Крыніца», а далей — у пераломных 90-х — зноў «Знамя юности». Для тых, хто толькі рабіў першыя крокі ў журналістыцы, Міхаіл Пятровіч быў настаўнікам і чулым дарадцам, для вопытных калег — сябрам, натхняльнікам, генератарам ідэй, які шчыра радаваўся поспехам іншых.**

**Член Саюза журналістаў, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, кандыдат філалагічных навук, аўтар некалькіх кніг... У апошнія гады Міхаіл Кацюшэнка ўзначальваў аддзел рэалізацыі і рэкламы кінастудыі «Беларусьфільм». Лёс адмераў яму ўсяго 68 гадоў жыцця**

**Супрацоўнікі РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» глыбока смуткуюць з прычыны смерці Міхаіла Пятровіча Кацюшэнкі і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

# ЗАЛАТЫ ЎЗРОСТ — УЗРОСТ ТВОРЧЫ

**Калі штодзённы кругаварот спраў раптам адпускае цябе на заслужаны адпачынак, спачатку адчуваеш цалкам зразумелы дыскамфорт. І не дзіўна — бо ў жыцці з'явіўся вольны час. Падумаць, успомніць. Вярнуцца да адкладзеных у юнацтве мараў. Адшукаць у сабе новыя таленты. Хтосьці пачынае актыўна цікавіцца здаровым ладам жыцця, хтосьці знаходзіць аднадумцаў у захапленні моднай скандынаўскай хадой, хтосьці спявае... І, напэўна, не сакрэт, што многіх захапляе літаратурная творчасць. На тое ёсць важкія падставы: вопыт пражытых гадоў дае нямала цікавых сюжэтаў. А нехта пачынае пісаць вершы: толькі, вядома, не такія, як у юнацтве, а глыбока абдуманыя, узважаныя.**

Чытаюць іх, раскрываючы запаветныя сшыткі, сваім родным, сябрам і знаёмым. Але ж хочацца ўбачыць свае творы і надрукаванымі. Толькі дзе? Асабліва калі піша чалавек не «раман з працягам», а пару-тройку вершаў за год? А калі сумняваецца ў сваіх сілах, але хацеў бы рызыкнуць надрукаваць невялікую падборку вершаў, апавяданне, урывак з вялікага твора? Каб пачуць думку чытачоў, ці варта працягваць.

Як быць, спытаеце? Не спяшайцеся засмучацца! У вас ёсць шанц на надрукаваны радок. Сабраць пад адну вокладку паўнапраўнага выдання (афіцыйна зарэгістраванага ў Кніжнай палаце Рэспублікі Беларусь) свае пробы пяра, сябе паказаць і на іншых паглядзець можа кожны ахвотны. Выдавецтва Аляксея Вараксіна прапануе вам такую магчымасць — паўдзельнічаць у выданні альманаха. Заплаціўшы параўнальна невялікую па цяперашніх мерках суму (200 тысяч бел. руб. за старонку), вы ўбачыце вашы творы надрукаванымі і бясплатна атрымаеце адзін асобнік альманаха, запаветнага «тоўстага часопіса», што пахне друкарскай фарбай, дзе ваша прозвішча ў спісе аўтараў. Захочаце падарыць блізкім такое выданне — звярніцеся ў выдавецтва. Мы паклапоцімся, каб вы змаглі купіць яшчэ некалькі асобнікаў.

У кожнага з вас з'явіцца шанц на надрукаваны радок. Каб даведаліся, каб памяталі. Каб у сямейным архіве засталіся не толькі фотаздымкі, але і часцінка вашай творчай душы.

**ВЫДАДЗІМ ВАШЫ ТЭКСТЫ:**
**успаміны, разважанні, вершы, прозу, навуковыя працы і іншае.**

Тэлефоны для даведак:
8017 **220-20-40;**
8029 **670-55-39;**
8029 **6-370-360.**

Паштовы адрас:
**220065, г. Мінск, а/я 33,**
**Выдавец ІП Вараксін А.М.**
**(для альманаха «Вехі»).**

Пакіньце свой след!

УНП 100343635

## Официальные правила Рекламной игры

Отличная идея!

# «Отлично всегда, удачно сегодня»

1. Настоящая рекламная игра называется «Отлично всегда, удачно сегодня» (далее по тексту – «Игра»), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее по тексту – «Правила») с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры дополнительной платы.

Игра имеет целью стимулирование продаж в Республике Беларусь розничных кредитных продуктов Закрытого акционерного общества «Идея Банк», за исключением кредитов «До зарплаты», «Стандарт», «Стандарт почтовый».

2. Организатором Игры является Закрытое акционерное общество «Идея Банк», зарегистрированное Национальным банком Республики Беларусь решением от 24 апреля 2004 года №58 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №807000122. Юридический адрес: Республика Беларусь, 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11, электронный адрес: info@ideabank.by (далее по тексту – «Организатор»).

3. Для контроля за ходом Игры создается Комиссия по ее проведению (далее по тексту – «Комиссия»). Комиссия осуществляет свою деятельность в период проведения Игры. Комиссия состоит из Председателя и 4 членов:

Председатель:

Кубински Артур, директор департамента розничного бизнеса ЗАО «Идея Банк»;

Члены Комиссии:

Дубовец Николай Николаевич, начальник управления поддержки продаж ЗАО «Идея Банк»;

Хватик Николай Николаевич, начальник управления обслуживания частных клиентов ЗАО «Идея Банк»;

Мисюк Ирина Владимировна, специалист по рекламе Иностранного унитарного предприятия «Адверком»;

Суходольская Инна Викторовна, специалист отдела маркетинга ЗАО «Идея Банк».

4. Участником Игры (далее по тексту – «Участник») может стать физическое лицо, являющееся гражданином Республики Беларусь либо имеющее вид на жительство в Республике Беларусь, выразившее желание принять участие в Игре путем заключения кредитного договора на условиях, установленных настоящими Правилами, и выполнившее условия участия в Игре.

Участником не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

5. Игра проводится на территории Республики Беларусь.

Срок начала Игры – 18 апреля 2016 года.

Срок окончания Игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Игры, – 21 июня 2016 года.

6. Для того чтобы принять участие в Игре, необходимо в период с 18 апреля 2016 года по 5 июня 2016 года заключить с ЗАО «Идея Банк» кредитный договор на условиях одного из розничных кредитных продуктов на сумму не более 50 000 000 (Пятьдесят миллионов) белорусских рублей, за исключением кредита «До зарплаты», «Стандарт», «Стандарт почтовый», и получить кредит согласно условиям заключенного договора. На день розыгрыша заключенный кредитный договор должен быть действующим и не погашенным досрочно.

7. Призовой фонд Игры.

В рамках Игры в качестве призов разыгрываются денежные средства в размере суммы процентов за пользование кредитом за 12 месяцев, согласно графику возврата кредита, а также дополнительный приз в размере денежных средств, рассчитанных исходя из ставки подоходного налога к сумме приза. Срок пользования кредитом исчисляется со дня, следующего за днем предоставления кредита.

Призовой фонд сформирован в следующем размере:

| № | Наименование | Количество призов | Предельная сумма на 1 приз, белорусских рублей | Всего, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Денежные средства в размере суммы процентов по кредиту за 12 месяцев согласно графику возврата кредита, а также дополнительный приз в виде денежных средств | 35 | 18 189 537 и дополнительный денежный приз в сумме 2 570 046 | 726 585 405 |

Призовой фонд Игры в размере 726 585 405 (Семьсот двадцать шесть миллионов пятьсот восемьдесят пять тысяч четыреста пять) белорусских рублей сформирован за счет денежных средств Организатора.

8. Права участников Игры.

Участник имеет право: знакомиться с Правилами Игры, принимать участие в Игре на условиях, определенных Правилами, и получать соответствующие призы (при условии соблюдения Правил).

9. Розыгрыш призов, определение победителей Игры.

Розыгрыши призов осуществляются в 15.00 по адресу: 220034, РБ, г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11:

- 26 апреля 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период с 18 апреля 2016 года по 24 апреля 2016 года;
- 3 мая 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период с 25 апреля 2016 года по 1 мая 2016 года;
- 12 мая 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период со 2 мая 2016 года по 8 мая 2016 года;
- 17 мая 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период с 9 мая 2016 года по 15 мая 2016 года;
- 24 мая 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период с 16 мая 2016 года по 22 мая 2016 года;
- 31 мая 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период с 23 мая 2016 года по 29 мая 2016 года;
- 7 июня 2016 года. В розыгрыше принимают участие Участники, заключившие кредитный договор на условиях, установленных настоящими Правилами, в период с 30 мая 2016 года по 5 июня 2016 года.

В розыгрыше призов принимают участие все участники Игры, при этом участники Игры, выполнившие условия настоящих Правил более одного раза, принимают участие в розыгрыше один раз.

Определение победителей осуществляется с помощью лототрона. Для проведения каждого розыгрыша призов используется набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9.

За ходом каждого розыгрыша призов следит Комиссия по проведению Игры. Итоги каждого розыгрыша призов Игры фиксируются в протоколе Комиссии, который составляется и подписывается присутствующими членами Комиссии.

Определение выигрышных номеров кредитных договоров получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из лототрона.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера член Комиссии помещает в лототрон шары с номерами, соответствующими первым слева цифрам номеров кредитных договоров, участвующего в розыгрыше. Член Комиссии извлекает из лототрона один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

После этого в лототрон загружаются все десять шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Номер шара вносится в протокол, производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах порядковых номеров в базе номеров кредитных договоров и при наличии совпадения выпавший номер шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера. В противном случае извлеченный шар не возвращается в лототрон, и член Комиссии извлекает следующий шар. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон соответствующих разрядов порядковых номеров в базе номеров кредитных договоров.

Таким образом, в каждом розыгрыше определяются по пять победителей Игры.

Организатор извещает победителей о выигрыше заказными письмами с уведомлением по адресам, указанным в заключенных с ЗАО «Идея Банк» договорах, в течение 2 дней после проведения каждого розыгрыша.

10. Вручение призов победителям Игры.

Победитель получает приз, подписав документы о согласии на получение приза в Центре банковских услуг или в Центре обслуживания, или в Центре обслуживания бизнеса №1, где он оформлял кредит. Выдача призов производится:

- Розыгрыш от 26 апреля 2016 года – до 11 мая 2016 года,
- Розыгрыш от 03 мая 2016 года – до 17 мая 2016 года,
- Розыгрыш от 12 мая 2016 года – до 26 мая 2016 года,
- Розыгрыш от 17 мая 2016 года – до 02 июня 2016 года,
- Розыгрыш 24 мая 2016 года – до 07 июня 2016 года,
- Розыгрыш 31 мая 2016 года – до 14 июня 2016,
- Розыгрыш 7 июня 2016 года – до 21 июня 2016 года включительно.

Организатор переводит денежные средства в указанные выше сроки на счета по учету на временной основе для погашения задолженности по процентам согласно графику возврата кредита.

При получении приза победитель должен предъявить документ, удостоверяющий личность (действующий паспорт гражданина Республики Беларусь/вид на жительство).

Если победителем становиться лицо, признанное недееспособным или ограниченно дееспособным, право получения приза переходит к его законным представителям.

В случае если победитель не обратиться за получением приза в указанный срок, либо не выполнит иные требования Правил, либо откажется от получения приза, победитель Игры теряет право на получение приза, и приз остается в распоряжении Организатора.

Победитель, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые для его получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные настоящими Правилами, а также формальности, необходимые для получения приза.

В случае частичного досрочного погашения кредита или полного погашения кредита победителем ранее 12 месяцев, денежные средства в размере остатка суммы процентов используются согласно распоряжению Организатора.

В случае наличия просроченной задолженности по основному долгу кредита свыше 14 календарных дней победитель теряет право на денежные средства для погашения процентов по кредиту, и данные денежные средства используется согласно распоряжению Организатора.

11. Победитель несет обязанность по уплате подоходного налога в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление в бюджет подоходного налога осуществляется Организатором, выступающим налоговым агентом, в момент выдачи приза в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Денежные средства, подлежащие выплате Участникам в виде дополнительного денежного приза, направляются, в соответствии с платежными инструкциями Участников, на оплату подоходного налога.

В случае если денежных средств, выплачиваемых победителю в виде приза, не достаточно для выплаты подоходного налога, победитель должен внести в кассу ЗАО «Идея Банк» недостающую сумму исчисленного налога.

Факт участия в Игре подразумевает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, интервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в рекламных материалах. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете, а равно и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения. Все права на такие интервью и результаты съемки будут принадлежать Организатору.

Организатор не несет ответственности за работу почтовых служб, телефонной связи и Интернета.

Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

В случае письменного отказа победителя от получения приза, либо неполучения его в установленные Правилами сроки, либо нарушения победителем настоящих Правил, приз остается у Организатора и используется по его усмотрению.

12. Информация об Игре, публикация Правил Игры.

Правила Игры будут опубликованы в газете «Звязда» до начала Игры. Результаты Игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» не позднее 21 июня 2016 года.

Дополнительно информацию об Игре можно получить по телефону: + 375 (17) 306-33-14 либо короткому номеру 7555 с мобильных (Пн-Пт: 08:00 – 21:00, Сб-Вс: 09:00 – 19:00) или на сайте www.ideabank.by.

Свидетельство № 2734 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 12 апреля 2016 года Министерством торговли Республики Беларусь.




## ПАСЛУХМЯНЫЯ ДОЧКІ

Са «Звяздой» мы сябруем даўно і чытаем не толькі самі: газету любіць забіраць суседка, а да яе — і досыць часта цяпер — з Масквы прыязджае сястра...

Так што прачыталі яны неяк падборку «вясёлых і праўдзівых гісторый», ад душы пасмяяліся, а потым кажуць: «А можа, і наша гісторыя падасца займальнай?»

Мне засталося толькі запісаць.

...Іх сям'я жыла тады ў Нясвіжскім раёне. Бацька працаваў настаўнікам, маці — у дзіцячым садку. Як усе вясковыя жыхары, яны трымалі гаспадарку, садзілі агароды. Моды на цяпліцы яшчэ не было — без іх стараліся раней пасеяць, лепей дагледзець... Так што ў той год пад канец чэрвеня нарасло ў іх шмат агуркоў — невялічкіх, калючых.

— Вы, дзеткі, не чапайце, не зрывайце іх, — сказала неяк маці, ідучы на працу. — Вечарам я засалю.

Сёстры, вядома ж, паабяцалі і пабеглі гуляць да суседскіх дзяцей.

Пад абед вымерхаліся: абедзвюм захацелася нешта з'есці.

— А давай па гурочку, — прапанавала адна з дзяўчынак, прыбегшы дадому.

— Не, — запярэчыла другая. — Мама ж сказала не рваць.

— Дык мы і не будзем. Мы адкусім па трошкі...

Разам сталі думаць, як гэта зрабіць?

— А давай вось так, — прапанавала меншая і паказала прыклад: лягла ў баразёнку, выцерла спаднічкай бліжэйшы агурочак і адкусіла. Старэйшая сястра зрабіла тое ж. Смаката!

— Давай яшчэ па адным... Не, давай яшчэ па тры, і агуркоў — хопіць.

Бо побач з імі была яшчэ градка з морквай.

— Давай і яе пакаштуем, — вырашылі дзяўчынкі.

Вырвалі па некалькі штучак, большыя з'елі, пабеглі гуляць. Праз нейкі час зноў вярнуліся ў градкі на перакус...

Пад вечар прыйшла з працы маці. Патупала па хаце, падалася ў агарод. Нарвала там лісця чорных парэчак, вішні, хрэну, маладога кропу, узяла кошычак — пайшла выбіраць агуркі. Праз колькі хвілін вяртаецца ў хату і кажа:

— Не ведаю, што і падумаць: мусіць, нейкія зайцы ўлезлі ў нашу моркву, панадкусвалі агуркі...

— Але ж днём яны не бегаюць, — адказвае бацька.

— Дык а хто ж тады?.. Вы, дзяўчаткі, не бачылі?

Малыя ў слёзы і ў адзін голас:

— Гэта мы...

— А чаму ж надкусвалі?.. Хай бы ж сарвалі той агурок ды з'елі.

— Дык вы ж самі сказалі не зрываць. Вось мы і паслухалі...

**Л. Скіндзер,** *г. Івацэвічы.*

## УСЁ «ПА-ЧЭСНАМУ»!

У нас у Лучыне, калі нехта браўся паўтараць, пляскаць адно і тое ж, заўсёды казалі: «Ізноў за рыбу грошы!»

Вось і я — зноў «за рыбу»... Тым больш што яе ў нас — рэчка пад бокам — лавілі, ловяць і, дасць Бог, будуць лавіць. Праўда, цяпер — выключна ў дазволены час і дазволенымі сродкамі. Гэта раней — як хацелі і чым хацелі, толькі ў нераст не лютавалі. А так — выплывалі на сваіх абшыванках, са сваімі сеткамі. Нехта лавіў адзін, нехта — гуртам...

Адна з кампаній была, можна сказаць, неразлучнай і складалася з Івана — мужчыны, прыстойнага ва ўсіх адносінах, ды двух Мішак. Прычым Мішка-другі — чалавек як чалавек быў, а вось першы — тып яшчэ той: любіў, каб менавіта яму ўсё найлепшае, найбольш і, як той казаў, на халяву. За гэтую прагнасць мужыкі і недалюблівалі яго, і не раз вучылі, ды што толку...

Ну вось, напрыклад, наловяць яны рыбы, занясуць да Івана (ён жыў ля Дняпра). Перш-наперш паставяць юшку варыць, потым развесяць сеткі сушыць, і толькі потым пачынаюць рыбу дзяліць. Сенцы ў Івана вялікія, так што ёсць дзе разварнуцца — раскласці яе на асобныя кучкі.

Адно шкада: як ты ні старайся, а роўнымі яны ніяк не будуць, бо нават найлепшага ўлову можа не хапіць. Ды і кавалкі ад галавы і ад хваста, згадзіцеся, нераўнацэнныя... Значыць, далей трэба «падключаць фартуну».

Тройца рабіла гэта так: Мішка першы станавіўся да рыбы спінай, а Іван альбо Мішка-другі пальцам паказвалі на нейкую з кучак і пыталі: «Гэта каму?».

Усё як быццам «па-чэснаму»? Так. Але ж хіба ў гэта паверыш, калі, як ты «сляды не блытай», а шчасціць пры дзяльбе толькі аднаму — Мішку-першаму.

— Ну хоць бы раз яму горшая кучка выпала, хоць бы раз ён з носам застаўся, — кажа неяк Іван сваёй Мані. — Няйначай, сакрэт нейкі ведае.

— А што ты думаеш? — падтаквае жонка. — Можа, і сапраўды? А можа, з нячысцікам знаецца?

Паплявалі яны разам цераз левае плячо, перахрысціліся ды гамоняць далей.

А побач іхні сынок гуляў, размову гэтую чуў і нават пяць капеек сваіх уставіў:

— Я вось што заўважыў, — кажа бацькам, — калі вы ў сенцах рыбу дзеліце, дзядзька Міша (той першы, значыць. — **Аўт.**) увесь час у люстэрка глядзіць.

— У якое люстэрка? — пытае ў малога Іван.

І тут жа куляй у сенцы. Так і ёсць, усё проста: каля вешалкі Маня сабе люстэрка на цвічок павесіла — невялічкае, але ж лаўка, дзе рыба ляжыць, як на далоні ў ім!..

Пасля таго, як таямніца гэтая адкрылася, нехта іншы мог бы пайсці да кампаньёна і твар пабіць, бо было ж за што! Ну сапраўды. Але Іван — не. Назаўтра, як нічога ніякага, ён з абодвума Міхасямі ў рыбу паплыў. Пакуль лавілі, як бы між іншым сказаў:

— Нешта мая Маня стала носам круціць. Ёй, ці бачыце, лешч надта кастлявы стаў, язь — дужа тлусты. Сказала, што сёння плотачак хоча — як найдрабнейшых.

Рыбакі іх налавілі, у асобную кучку склалі (Мішка першы пры гэтым найбольш стараўся)...

Потым, па завядзёнцы, адвярнуўся спінай, каб з дзвюх добрых кучак сабе выбраць лепшую, але тут Іван узяўся... здымаць люстэрка.

— Т-т-ты што гэта робіш? — спытаў Мішка першы. — Навошта?

— Дык досыць, — сказаў гаспадар. — Ты ж у яго нагледзеўся. Хай цяпер Маня сабой палюбуецца. У хату занясу... А што да рыбы, то сёння мы далей дзяліць не будзем: гэтыя дзве кучкі нам з Мішам, а плотачкі табе, брат. Ты заслужыў.

Думаеце, Мішка засаромеўся? Не! Сказаў:

— Хлопцы, а што я жонцы скажу?.. Скіньцеся хоць па язіку.

— Дык вы ж іх наеліся. До, брат. Зараз трэба плотак паспытаць.

Мішка, вядома ж, засмуціўся, стаў мацюкацца, мужыкі — таксама. Але ж яны не бабы, каб праз нешта ўзяць ды пасварыцца. Да таго ж юшка падаспела, выпіўка была: яны па «сотачцы» ды за лыжкі.

І халера з тым, што найлепшыя кавалкі рыбы з казана павыцягваў Мішка-першы.

...На Дняпро з ім мужыкі па-ранейшаму плавалі, кучкі між сабою дзялілі, але цяпер — сапраўды «па-чэснаму».

Яшчэ і таму, што падчас дзяльбы Іванаў сынок пад нагамі круціўся. І бацькавы кампаньёны ўжо ведалі: гэтага малога не ашукаеш, ён усё заўважыць.

**Соф'я Кусянкова,** *в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

## «А РАПТАМ ЖОНКА?»

Гэтую гісторыю мне расказаў мой знаёмы, немалады ўжо чалавек. Завуць яго Анатоль.

Дык вось аднойчы, яшчэ ў маладосці, сустрэліся яны з сябрам Іванам і захацелі расслабіцца, недзе пасядзець...

— Слухай, а давай да мяне, — прапануе раптам Іван. — Бутэлька дома ёсць, жонкі з дзецьмі няма, яны ў вёску да бабулі паехалі. Так што ніхто замінаць не будзе.

Як надумалі мужыкі, так і зрабілі: падсеў Анатоль да сябрука ў легкавік... Едуць па вуліцы памалу, бо дзень выдаўся пагодны, вясновы; настрой — акурат такі ж, машына добрая, дзяўчат ды маладзіц на тратуары — хоць каўшамі бяры!

— Іван, глянь, якая прыгожая! — раз-пораз паказваў Анатоль. — А вось гэта... Гэта, брат, яшчэ прыгажэйшая!

І ўжо да яе, да той харашухі, высунуўшыся з акна:

— Гэй, мілая, паедзем з намі!

— Абыдзешся, — кіне ўслед якая дзяўчына (тады, дзякаваць Богу, яны нясмелыя былі, не дужа згаджаліся...).

А значыць, сябрукі спакойна ехалі далей і — адпаведна — бачылі болей. Па тратуары, наперадзе ў іх, маладзічка ішла — ды ў такім чырвоным лёгкім плашчыку...

— Вось гэта фігурка! Вось гэта ножкі! — аж прысвіснуў Анатоль. — А прычоска, прычоска якая!.. Паглядзі, брат!

Машына тым часам амаль дагнала, амаль параўнялася з той «фігуркай»: яшчэ трохі і можна ацаніць яе не толькі са спіны...

— Гані! Хутчэй! — толькі ўбачыўшы ў твар, загадаў Анатоль Івану, а сам, што называецца, палез пад сядзенне.

— Ты чаго гэта? — абагнаўшы жанчыну, спытаў у яго кіроўца.

— А ты што — не пазнаў? Ды гэта ж жонка мая, Валя! А я ўжо зяпу адкрыў — хацеў паклікаць яе катацца! Во ўліп бы — як ліса ў саладуху!

Пашчасціла хлопцам, пранесла. На радасцях яны ад душы пасмяяліся — і пакуль ехалі, і потым, пакуль чаркавалі...

А пад вечар Анатоль вярнуўся дамоў і, ведама ж, падпіўшы, ва ўсім прызнаўся Валі. Яна, як высветлілася, упершыню надзела новы чырвоны плашч, які купіла яшчэ зімой, пад настрой зрабіла прычоску, а прыгожая фігура ды ножкі ў яе заўсёды былі... Што, як відаць, не перашкаджала яе сужэнцу заглядацца на іншых.

— Валацуга ты, — паставіла «дыягназ» жонка. — На чужых жанчын свае бельмы лупіш, па чужых дамах гарэліцу п'еш...

— Даруй, каханая, я болей не буду, — паабяцаў ёй Анатоль.

І пасля гэтага, як ні цягнула, але на іншых маладзіц не глядзеў. Па-першае, помніў, што старыя людзі казалі: «Не заглядайся на чужых жонак: не скасееш, дык здурнееш». А па-другое, баяўся зноў пераблытаць.

**Мікалай Рылка,** *г. Ганцавічы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.** *dounar@zviazda.by*

БПС-СБЕРБАНК

Дата уведомления – 15.04.2016

**Уважаемые Владельцы (физические лица)**

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

Операции по неактивному счету можно совершить в любом подразделении Банка.

Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефону:
**148 – в стационарной сети**
**5-148-148 – в мобильных сетях**
**(+375 29/44) 5-148-148 – для международных звонков**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк».

## Извещение о проведении 16 мая 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Место-нахождение предмета торгов | Начальная цена предмета торгов без учета НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| 1. | Торговое помещение общей площадью 21,7 кв.м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165507 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-1 | 1 073 200 000 | 100 000 000 |
| 2. | Помещение клуба общей площадью 636,6 кв.м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165508 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-2 | 18 776 000 000 | 1 000 000 000 |
| 3. | Торговое помещение общей площадью 40,2 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165509 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-3 | 1 831 800 000 | 180 000 000 |
| 4. | Помещение финансового назначения общей площадью 329,6 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/D-708165510 | г. Минск, ул. Немига, 30/1-4 | 12 801 100 000 | 700 000 000 |

**Продавец имущества:** МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч», ул. Короля, 2, АБК, каб. 415, 220004, г. Минск.

**Организатор торгов:** коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов**:

победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

дальнейшее использование имущества осуществляется согласно генеральному плану г. Минска;

дальнейшее использование имущества осуществляется с учетом требований Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»;

при приобретении права собственности на предмет торгов (продаваемое имущество) покупатель обязуется на протяжении одного месяца подписать охранное обязательство в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь».

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего МО ОАО «Луч» – управляющей компании холдинга «Обувь – «Луч», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **16 мая 2016 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.04.2016 по 12.05.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: **(017)327-48-36** (государственное предприятие «МГЦН»); **(017)200-12-65, 226-59-70** (МО ОАО «Луч» – управляющая компания холдинга «Обувь – «Луч»).

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** |

| **Предмет аукциона** | | | |
|---|---|---|---|
| **Лот №** | **Наименование, общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
| **1** | **Гараж № 226,** 16,1 кв.м | 500/D-14030 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 226 |
| **2** | **Гараж № 267,** 16,1 кв.м | 500/D-14067 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 267 |
| **3** | **Гараж № 278,** 15,8 кв.м | 500/D-14075 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 278 |
| **4** | **Гараж № 351,** 15,9 кв.м | 500/D-14128 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 351 |
| **5** | **Гараж № 423,** 15,3 кв.м | 500/D-14180 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 4В, пом. 423 |
| **6** | **Гараж № 26,** 16,4 кв.м | 500/D-13953 | г. Минск, ул. Ф. Скорины, д.4В, пом. 26 |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 151 500 000 белорусских рублей** | | | |
| **7 -15** | **Машино-место № 121, № 123, № 127, № 129, № 131, № 132, № 133, № 136, № 137, № 138** | | г. Минск, пр-т Независимости, 168/3-1г |
| Лоты № 6–15 расположены в подземной автостоянке, общ. пл. 6299,0 кв.м с инвентарным № 500/D-70793116 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% каждого Лота – 297 000 000 белорусских рублей** | | | |
| **16** | **Гаражи на 4 автомашины,** 89,3 кв.м | 102/С-9461 | Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114 |
| **Начальная цена с НДС 20% – 167 000 000 белорусских рублей** | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **30** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

**Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 02.03.2016 г.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.04.2016 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **25.04.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +37517-280-36-37; +375 29-183-69-71. auction@cpo.by; www.cpo.by.** |

# Свая хатка, як родная матка

**Па гарызанталі: 1.** Не хата гаспадара красіць, а ... хату (прык.). **5.** «У хаце добры лад і згода, // Як патрабуе і ..., // Паважнасць вечара святога». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Каляды»). **9.** Добрая то ..., што ў хаце печ (прык.). **10.** У даўнія часы дзяржава, заснаваная на панаванні арыстакратычных вярхоў. **11.** «..., у якім няма кніг, падобны да цела, пазбаўленага душы». Цыцэрон. **12.** Дом — поўная ... (прык.). **14.** ..., або падпечнік. У беларускай міфалогіі дух хаты. **15.** Малаазійская багіня, маці багоў. **19.** Характво, прыгажосць. **20.** Лёгкая горная парода. **21.** Доўгі тонкі вусік на каласках жыта, пшаніцы, ячменю. **22.** У хаце ў Цімошкі кошка, ... ды мошка (прык.). **24.** Майстар сваёй справы. **25.** Чорная таполя. **28.** «А ... бабу на лапату // Перакінуў цераз хату, // І саломкай затрусіў, // Каб сабака не ўкусіў». Прыпеўка. **32.** Муж з хаты, а да жонкі ... багаты (прык.). **33.** Спецыяліст, які кіруе апаратам. **34.** Тое, што і доля. **35.** У сваёй хаце і ... помач (прык.). Мой дом — мая ... (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** Хоць малы ..., ды мяса варыць (прык.). **2.** Дзе сава і ..., там носа не тыч (прык.). **3.** Цвёрды слаісты мінерал. **4.** Гучны смех. **5.** Грудзі (устар.). **6.** Нізкая гліняная пасудзіна з вузкім горлам. **7.** Духавы народны музычны інструмент. **8.** Мохавае балота. **13.** Шчасліваму і ў сне ... сніцца (прык.). **16.** Свая хатка, як родная ... (прык.). **17.** ..., або дамавік, яздун. Маленькі драпежны звярок, у якога, паводле павер'яў, могуць ператварацца малочныя ведзьмы. **18.** Перашкода ў развіцці чаго-небудзь (перан.). **21.** Гаспадыня ў хаце, што ... ў мёдзе (прык.). **23.** «Буду я цябе любіць, // Буду дужа шанаваць, // ... папалам дзяліць, // Гора з хаты выганяць». З беларускай народнай песні «Пайду, пайду, Ясю мілы». **26.** «Дом — гэта там, дзе тваё ...». Пліній Старэйшы. **27.** Мілы той ..., дзе рэзалі пупок (прык.). **29.** «Як у вас, так і ў нас: // Сярод хаты ... // Дзед бабу цалаваў, // Аж губамі плямкаў». Прыпеўка. **30.** ... каля хаты крычыць — да нараджэння дзіцяці (прыкм.). **31.** Укрыцце для стральбы. **34.** ... і вада — брат і сястра (прык.).



**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 1. Гаспадар. 5. Прыгода. 9. Рэч. 10. Алігархія. 11. Дом. 12. Чаша. 14. Хатнік. 15. Ма. 19. Краса. 20. Апока. 21. Асцюк. 22. Камар. 24. Ас. 25. Ясакар. 28. Дзед. 32. Кум. 33. Апаратчык. 34. Лёс. 35. Качарга. 36. Крэпасць.
**Па вертыкалі:** 1. Гаршчок. 2. Сыч. 3. Агат. 4. Рогат. 5. Персі. 6. Гляк. 7. Дуда. 8. Імшара. 13. Шчасце. 16. Матка. 17. Ласка. 18. Тормаз. 21. Аладкі. 23. Радасць. 26. Сэрца. 27. Куток. 29. Ямка. 30. Сава. 31. Акоп. 34. Лес.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.08 | 20.12 | 14.04 |
| Віцебск — | 5.55 | 20.04 | 14.09 |
| Магілёў — | 5.58 | 20.02 | 14.04 |
| Гомель — | 5.58 | 19.55 | 13.57 |
| Гродна — | 6.24 | 20.26 | 14.02 |
| Брэст — | 6.28 | 20.24 | 13.56 |

### Месяц

*Першая квадра 14.04—21.04.*
*Месяц у сузор'і Льва.*

### Імяніны

*Пр. Палікарпа, Ціта.*
*К. Анастасіі, Базыля, Вацлава.*



Фота Наталлі АЛЯКСАНДРАВАЙ.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +15..+17°С | КІЕЎ +12..+14°С | РЫГА +12..+14°С |
| ВІЛЬНЮС +13..+15°С | МАСКВА +4..+5°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +2..+4°С |

Даты | Падзеі | Людзі

### 15 КРАСАВІКА

*Міжнародны дзень культуры. Адзначаецца па ініцыятыве грамадскіх арганізацый свету. У гэты дзень у 1935 годзе ў Вашынгтоне быў падпісаны Дагавор аб міжнародных нормах аховы культурных каштоўнасцяў (Пакт Рэрыха) — першы ў гісторыі міжнародны дагавор, які абвясціў ахову мастацкіх і навуковых устаноў і гістарычных помнікаў.*

**1452** год — нарадзіўся Леанарда да Вінчы, італьянскі мастак, вучоны, вынаходнік, універсальны геній эпохі Адраджэння. Сёння Леанарда вядомы ў першую чаргу як мастак. Яго пэндзлю належаць «Мадонна Літа», «Дама з гарнастаем» і самая вядомая ў свеце карціна — «Мона Ліза» (Джаконда)... Леанарда аддаваў жывапісу не надта шмат часу, таму колькасць яго работ не такая вялікая. Ён вывучаў прыроду, імкнуўся ахапіць прынцыпы рэалізму, законы ўспрымання — і вывеў жывапіс на якасна іншую прыступку. Ён не ўдзельнічаў у тэарэтычных дыскусіях і спрэчках — проста ствараў шэдэўры. Дзякуючы Леанарда лінія малюнка атрымала права на размытасць, памякчэлі колеравыя кантрасты, малюнак і рэальнасць сталі бліжэйшымі, але і больш таямнічымі. І сёння ідзе бясконцы паток наведвальнікаў у Луўр, дзе захоўваецца партрэт Джаконды, каб зірнуць на несмяротнае тварэнне майстра. Зрэшты, сам майстар лічыў сябе не мастаком, а навукоўцам і інжынерам. Яго «Вітрувіянскі чалавек» да гэтага часу служыць ідэалам прапорцый не толькі чалавечага цела, але і Сусвету ў цэлым. Ён вынайшаў парашут, веласіпед, прататып танка, пражэктар, катапульту. Мноства іншых інжынерных задум захаваныя ў накідах, малюнках, чарцяжах і эскізах майстра.

**1912** год — у ноч з 14 на 15 красавіка пасля сутыкнення з айсбергам у Паўночнай Атлантыцы затанула найбуйнейшае пасажырскае судна пачатку XX стагоддзя «Тытанік», створанае на брытанскіх верфях «Харланд энд Вулф». З 2200 пасажыраў і членаў каманды ў катастрофе загінулі больш за 1500 чалавек. Абломкі гіганцкага судна выявіла ў 1985 годзе на дне Атлантыкі блізу вострава Ньюфаўндленд на глыбіні амаль 4 тысяч метраў экспедыцыя пад кіраўніцтвам амерыканскага даследчыка Роберта Баларда.



**1951** год — у Лондане адбыўся першы конкурс прыгажосці «Міс Свету» — афіцыйны міжнародны конкурс прыгажосці на планеце. Дзякуючы гэтай падзеі Лондан атрымаў славу сталіцы сусветнай прыгажосці.

Было сказана

**Янка СІПАКОЎ, паэт, пісьменнік:**
*«Зыходны пункт для творчасці — сэрца. Ад яго павінна пачынацца любая мастацкая рэч, пра што б яна ні расказвала».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

**М**ЯДЗВЕДЗЬ — звер, які карыстаецца асаблівай пашанай сярод усходніх славян. З аднаго боку, моцная жывёла выклікала захапленне; з другога — здольнасць хадзіць на задніх лапах прыраўноўвала яго да чалавека і надзяляла магічнай сілай.

◈ У паданнях мядзведзь і чалавек лічыліся сваякамі, таму што ў мядзведзя быў ператвораны чалавек; у мядзведзя лапы, як чалавечыя рукі; ён мыецца, любіць мёд і гарэлку, клапоціцца аб сваіх дзецях, як чалавек; разумее чалавечую мову і нават смокча лапу, як дзіця. «Калі Хрыстос хадзіў па зямлі, то адзін чалавек хацеў напалохаць яго: вывернуўшы кажух поўсцю наверх, апрануў на сябе і пайшоў на карачках насустрач Хрысту. Хрыстос пазнаў, што гэта чалавек, пазнаў і намеры яго, што ён хоча напалохаць яго, і таму сказаў: «Хадзі так заўсёды — векі вечныя». Вывернуты кажух прырос да цела чалавека.

◈ І ў старажытныя часы, і пазней паляванне на мядзведзя было забаронена. Забаранялася ўжываць яго мяса і шыць вопратку з яго скуры. Строгая забарона існавала і на простае згадванне мядзведзя. Лічылася, што гэта моцная і грозная жывёліна імгненна адзавецца і з'явіцца побач. Таму ў размовах мядзведзя часцей за ўсё называлі такімі словамі: «сам», «гаспадар», «дзядуля», «млынар», «лясун», «касматы», «аўсяннік», «бортнік», «касалапы» і г.д. Да і сама назва «мядзведзь» узнікла з-за падмены слоў, якія яго характарызуюць: той, хто ведае, дзе мёд. Больш старажытная назва гэтай жывёлы — «бэр» (і сёння яго «месца жыхарства» завецца бярлогай, ці «логавам бэра»).

◈ Культ мядзведзя ў народнай традыцыі быў звязаны з культам Вялеса. Таму мядзведзя надзялілі функцыямі ахоўніка свойскай жывёлы. Каб засцерагчы яе ад сурокаў, у хляве, стайні вешалі амулеты. Для таго ж хату і гаспадарчыя пабудовы абкурвалі мядзведжай поўсцю.

## УСМІХНЕМСЯ

**Геніяльная фраза ад жонкі:**
**— Давай я памыю галаву, а ты — посуд і падлогу.**

— Мама, я ўсё з'еў!
— Таму мы і хочам, каб ты жыў асобна.

**Надзея Бабкіна, Ала Пугачова, Алёна Свірыдава... У адрозненне ад Анджаліны Джалі расійскія зоркі не ўсынаўляюць дзяцей, а выходзяць за іх замуж.**

Жыхары Зямлі перасяляюцца з вёсак у буйныя гарады, каб купляць там планшэты і камп'ютары і гуляць месяцамі ў «Вясёлую ферму».

**Нешта цягне мяне сярод ночы да халадзільніка. Напэўна, гэта магнітікі.**

— Дзяўчына, а ў вас закурыць не знойдзецца?
— Малады чалавек, у мяне нават знойдзецца выпіць, паесці і пераначаваць!

**Раніца пасля вечарынкі... З неадкладных спраў засталося толькі выцягнуць шампуры з дартса...**




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1485.
Нумар падпісаны ў 19.30 14 красавіка 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12